Раіса Баравікова

# ПРА КАШЭЧАГА КАРАЛЯ ВАРГІНА І МЫШКУ ПАДНОРКУ








Раіса Баравікова



# ПРА КАШЭЧАГА КАРАЛЯ ВАРГІНА І МЫШКУ ПАДНОРКУ





КАЗКІ З МІФАЛАГІЧНАГА ЛЮСТЭРКА

Мінск
Выдавецкі дом «Звязда»
2017

УДК 821.161.3-93
ББК 84(4Беи)-44
Б24

Мастак
*Марыя Міцкевіч*

Для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту

*Выпуск выдання ажыццёўлены па заказу*
*і пры фінансавай падтрымцы*
*Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь*

**Баравікова, Р. А.**

Б24 Пра кашэчага караля Варгіна і мышку Паднорку : казкі з міфалагічнага люстэрка : для дзяцей сярэд. шк. узросту / Раіса Баравікова ; маст. Марыя Міцкевіч. — Мінск : Звязда, 2017. — 128 с. : іл.

ISBN 978-985-575-129-9.

Міфалогія, напэўна, адна з самых прыцягальных сфер традыцыйнай народнай культуры. Да яе ў сваёй творчасці неаднойчы прынікалі як класікі, так і сучасныя пісьменнікі. Варта згадаць асобныя творы Яна Баршчэўскага, Уладзіміра Караткевіча, Людмілы Рублеўскай...

Да персанажаў беларускай міфалогіі звярнулася і вядомая пісьменніца, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Раіса Баравікова. З яе надзвычай цікавай прыгодніцка-казачнай кніжкі пра ката Варгіна чытачы даведаюцца, як пачуваюць сябе героі шматлікіх паданняў і казак у нашым часе. А таксама якія ў іх складваюцца стасункі з сучаснымі дзецьмі і ўвогуле з людзьмі ў XXI стагоддзі.

**УДК 821.161.3-93**
**ББК 84(4Беи)-44**

**ISBN 978-985-575-129-9**

© Баравікова Р. А., 2017
© Міцкевіч М. Э., ілюстрацыі, 2017
© Афармленне. РВУ «Выдавецкі дом «Звязда», 2017

## З'ЯЎЛЕННЕ КАТА ВАРГІНА

Кот Варгін перадумаў забягаць у пад'езд вялікага дзевяціпавярховага дома і цяпер сядзеў на круглай клумбе пад вокнамі, на якой ужо гатовы былі распусціцца цюльпаны. Хацелася есці. Прайшло некалькі дзён пасля таго, як ён збег ад выпадковых гаспадароў, дзе перабіваўся адно поснаю кашаю. Праўда, гэтаю поснаю кашаю перабіваліся і самі гаспадары, ды яшчэ салатаю. Бачыш ты, вегетарыянцы! Ён — не вегетарыянец. Каша і салата не для катоў. Тым больш не для Варгіна. «Дык у якую ж кватэру мне зараз патрапіць? — лянотна пазяхнуў Варгін. — Там, дзе ў вокнах гарыць святло, людзі яшчэ не спяць. Але як яны ўспрымуць маё нечаканае з'яўленне? — ён зноў пазяхнуў і пацёр тоўстаю лапаю вялікае чорнае вуха. — Гм-м, застаюцца кватэры за цёмнымі вокнамі. Зразумела, на стале ці на падлозе я нічога ядомага там не знайду. Але ж ёсць халадзільнік!» — і ён з задавальненнем аблізнуўся.

Трэба сказаць, што кот Варгін з лёгкасцю праходзіў праз любую сцяну, таму дзверцы халадзільніка для яго не былі перашкодай. Ён прыціснуў вушы да галавы, прыўзняўся на заднія лапы і ўздыбіў на спінцы чорную густую поўсць. Але скочыць на сцяну не паспеў. Чыясьці дужая рука ўхапіла яго за шкірку і прыўзняла. Тут жа пачуўся даволі прыемны голас:

— Ну і звер! Ды ты, браток, кот асабліва буйных памераў! Такога ў нас яшчэ не было. А чарнюшчы ты які! А хвасцішча! Ну гарнастай, чысты гарнастай, хоць і не белы!

Кот Варгін трымаў свае кіпцюры напагатове. Але апошнія словы чалавека ўлагодзілі яго, і ён дазволіў незнаёмцу ўнесці сябе ў пад'езд. Потым — у ліфт. А затым і ў кватэру на шостым паверсе. Мужчына ўключыў святло, апусціў Варгіна на падлогу, прыклаў палец да вуснаў:





— Цс-с-с, не мяўкні! Мае ўсе спяць. А я ў гаражы затрымаўся. Табе пашанцавала! Ну, ідзі на кухню, — падштурхнуў ён Варгіна. — Я зараз следам...

І сапраўды, праз некалькі хвілін гаспадар кватэры з'явіўся на кухні. Ён паставіў перад Варгінам сподачак, адчыніў халадзільнік. З пакета, які трымаў у руках, выклаў у халадзільнік досыць вялікі кавалак апетытнай духмянай каўбаскі. Потым зірнуў на ката і дастаў з халадзільніка смятану.

«Не для мяне харч», — пакруціў Варгін галавою. І ўсё ж ад смятаны не адмовіўся. Злізваў яе са сподачка шурпатым языком і слухаў гаспадара, які не пераставаў ім захапляцца:

— Прыгажун! І які ж ты прыгажун! Поўсць ажно ільсніцца. Вочы агнём гараць. Відаць, збег ад некага! Ну, нічога! Заўтра пазнаёмішся з Юрасікам і Наташкай. Няхай дзеці пазабаўляюцца з табою. А там, можа, і затрымаешся ў нас, згода?!

Кот Варгін лагодна завуркатаў і перакуліўся на спіну. Ён пачаў качацца па падлозе, лісліва выгінацца ва ўсе бакі, маўляў, палашчы мяне.

— Ну ўсё, хопіць, знаёмства адбылося.



Малайчына. Ласкавы коцік, — сказаў гаспадар. — Даядай сваю смятану. Мне заўтра на працу. Стаміўся на лецішчы. Трэба класціся спаць.

І кот Варгін застаўся адзін. Паважна адсунуў ад сябе сподачак са смятанай. Прыслухаўся. Натапырыў вушы. Потым асцярожна падышоў да халадзільніка. Спыніўся перад блішчастымі дзверцамі, выпусціў з пярэдніх лапаў кіпцюры і... Тут можна было б ускрыкнуць: «Ба-а-бах!» Але ніякага бабаху не здарылася. Кот Варгін быццам нырнуў у халадзільнік. Цалкам бязгучна. Гэтак жа бязгучна ён і вынырнуў з дзверцаў, трымаючы ў тоўстых лапах той самы вялікі кавалак духмянай каўбасы, які гаспадар кватэры, як аказалася, так неабачліва паклаў у халадзільнік.

Пах, што сыходзіў ад каўбасы, казытаў ноздры. І Варгін з асалодаю ўдыхаў і ўдыхаў яго. «Вясковая! Самаробная каўбаска! Даўнавата ж не было ў мяне такой вячэры!» — круцілася ў кашэчай галаве. І Варгін не вытрымаў. Асцярожна паклаў каўбасу на падлогу, схіліўся, ужо гатовы адкаштаваць ад кавалка. І тут



здарылася зусім нечаканае. Хтосьці моцна пляснуў яго па адным вуху, потым па другім. Ашаломлены кот міжволі адхінуўся. Ён атарапеў ад такога нахабства. Хто мог асмеліцца падняць руку на яго?! Самога Варгіна! А кавалак каўбасы тым часам прыўзняўся над падлогаю і павольна паплыў да дзверцаў халадзільніка. Дзверцы расчыніліся. І, як толькі каўбаса ўплыла ў халадзільнік, нехта нябачны хуценька зачыніў іх.

Кот Варгін проста аслупянеў і тут жа ашчэрыўся. Ён добра ведаў, што любыя дзверцы самі па сабе не расчыняюцца. Дарэчы, як і кавалкі каўбасы самастойна не перамяшчаюцца з аднаго месца на другое. «Тут нехта ёсць! І я зараз парву яго! — Варгін міжволі з усяе сілы шкрабануў кіпцюрамі па падлозе і раз'юшана зашморгаў носам, прынюхваючыся. — Задзяру!» — дадаў ён, азіраючыся па баках.

Па кухні яшчэ разліваўся духмяны пах каўбасы. Іншых пахаў не было, як Варгін не прынюхваўся. «Ды гэта ж проста насланнё нейкае! У гэтай кватэры не ўсё так добра, як здалося напачатку. Каўбаса рухалася, дзверцы халадзільніка расчыняліся, а я нікога наўкол не чую і не бачу», — Варгін задумаўся. Якраз у гэты момант з-пад невялікай шафы і пачулася лёгкае шорганне. Кот нават пабачыў два вочкі, што паблісквалі адтуль.

— Ты хто? — не без цікавасці запытаўся ён, і поўсць на яго спіне прыўзнялася.

— Я — мышка Паднорка, — з-пад шафы пачуўся вясёлы тоненькі галасок.

— Здагадваюся, што не леў, — расчаравана прамармытаў кот Варгін, які, не лішне будзе зазначыць, быў абыякавы да мышэй. Яго ў асноўным цікавілі і прывабліталі людзі.

— А хіба леў можа сядзець пад шафаю? Ты сказаў відавочную бязглуздзіцу. У гэтым краі спакон веку не водзяцца львы.





— Ну ўсё! Зараз лепш змоўкні. Не раздражняй. Дай даесці смятану. А то мігам такой жамяры ў тваю галаву напушчу — пчолак, мушак, матылёў розных, што ніякі



вядзьмак табе не дапаможа. Я — кот Варгін, кашэчы кароль! Мабыць, чула пра такога? — і ён падсунуў да сябе сподачак з недаедзенай смятанай.

— Ты згадаў ведзьмака? — прапішчэла мышка. — Ах, вядзьмак! Злосны стары Пацук! Так-так, не здзіўляйся. Пацук! Дзядок-вядзьмак памёр і з яго рота выскачыў гэты самы агідны Пацук! Ён і зачараваў мяне. Я такая была няшчасная. Гора мне было гора. Ён зрабіў мяне звычайнаю шэраю мышкаю. А я — прынцэса, самая сапраўдная. Дачка магутнага цара Паднора! Не ведаю, як гэта табе ўдалося, але ты зняў з мяне чары. Калісьці брыдкі Пацук так і сказаў, як толькі з'явіцца кот, які

не будзе на цябе паляваць, ты станеш зноў прынцэсаю. І вось ты з'явіўся! Ты не палюеш на мяне, Варгін. Ты не спрабуеш выманіць мяне з-пад гэтай шафы, — мышка на імгненне задумалася і радасна дадала: — Ах, ты проста хочаш спакойна даесці сваю смятану. Дык глядзі, мой высакародны кароль! Глядзі і здзіўляйся.

У гэты момант Варгін мусіў на імгненне заплюшчыць вочы. Кухню заліло ззянне. Гэта мышка Паднорка выбегла з-пад шафы і магла ўразіць хоць каго. Вушкі і лапкі ў яе былі залатыя. На шыі ззялі пацеркі з ізумрудаў ды яшчэ залаты ланцужок з вялікім і неймаверна бліскучым дыяментам. Ізумруды ўпрыгожвалі і паясок, якім мышка была падперазана.

— Хм-м, — з асцярогай расплюшчыў вочы кот Варгін. — Прызнацца, я ўражаны! Упершыню бачу мыш у такім ашаламляльна прыгожым убранні. — Ён з цікавасцю пазіраў на Паднорку і не знаходзіў патрэбных слоў, каб выказаць сваё захапленне. Нарэшце, проста запытаўся: — Ты жывеш у гэтай кватэры?

— Не. Я жыла на лецішчы ў клеці, — адказала мышка. — І з'явілася тут, можна сказаць, разам з табою. Мяне прывёз сюды гаспадар гэтага жытла. Выпадкова. Я неабачліва залезла ў яго пакет з нейкімі рэчамі і каўбасою.

— Хм-м, — злёгку пасміхнуўся кот Варгін і апусціў вочы. Ад дыямента на залатым ланцужку сыходзіла такое зыркае святло, што цяжка было глядзець на Паднорку, якая тым часам пачала ўжо развітвацца.

— Даруй, мне трэба спяшацца, — сказала яна. — Хачу як мага хутчэй сустрэцца з бацькамі. А ты тут, мяркую, застанешся надоўга.

— Думаеш? — Варгін запытальна зірнуў на Паднорку, якая ў яго голасе не пачула ўпэўненасці, таму і сказала:



— Думаю-думаю! Пакуль ты тут еў смятану, я паспела агледзець усю кватэру. У адным з пакояў спяць дзеці: хлопчык і дзяўчынка. Яны цябе не адпусцяць адсюль, вось пабачыш. Ты з імі пасябруеш.

І тут жа Паднорка паднялася на заднія лапкі. Куснула сябе за кончык залатога хваста — і быццам растала ў паветры. Аднак паспела крыкнуць ужо аднекуль здалёку Варгіну:

— Чакай мяне, кашэчы кароль! Я, магчыма, яшчэ вярнуся. Ты самы лепшы на свеце кот! Ты ўратаваў мяне ад чараў!

— Мя-я-яў, — як маланкамі, бліснуў зялёна-жоўтымі вачамі Варгін. І дзіва! Ён таксама знік. Але праз некалькі хвілін зноў з'явіўся на кухні. З ніадкуль, з цемры. — Не дагнаў! Толькі запыхаўся! Значыцца, трэба заставацца тут. Паднорка папрасіла чакаць яе. Для чаго? Навошта? — і адказу на гэтыя пытанні ён не знаходзіў. Задумаўся, потым уздыхнуў і пачаў дзерці дзвярны вушак кіпцюрамі. Гэтак заўжды ён рабіў у хвіліны вялікай незадаволенасці ці моцнага хвалявання.



## НУ І НАВОШТА НАМ КОТ!

Пад гэтую гучную фразу, вымаўленую з асаблівым націскам, кашэчы кароль прачнуўся. Ён пабачыў яшчэ даволі маладую жанчыну, відаць, гаспадыню гэтай кватэры. Яна схілілася над ім і працягвала гнеўна абурацца:

— Лёня, не трэба! Не выпрабоўвай маю цярплівасць! Зараз жа вынесі гэтага няшчаснага з кухні туды, адкуль прыцягнуў яго! Не зробіш гэтага ты, я сама яго вынесу!

Кот Варгін тут жа падхапіўся. Адмахнуўся лапаю ад яе доўгіх валасоў, што звісалі над ім. І ўмомант адскочыў ад цёплай сцяны, каля якой ён даволі салодка праспаў усю ноч. Сапраўды, як ні дзіўна, пасля ўсіх начных нечаканасцяў яму спакойна спалася гэтай ноччу. І вось



табе на-а! Гэта ён — няшчасны?! Ах ты, цяцера касматая, не разумее, хто перад ёю! Ды я зараз...

Кашэчы кароль ашчэрыўся. Выгнуў спіну. Выпусціў кіпцюры. Стаў перабіраць лапамі.

— Ён хоча накінуцца на мяне! — закрычала жанчына і адскочыла ад ката, замахала рукамі: — Лёня, вынось! Каму кажу, выкідвай гэтую пачвару! Ён ужо кіпцюры выпусціў! — і жанчына ўхапіла ручнік, што вісеў на сцяне.

Лёня, а гэта і быў гаспадар кватэры, падышоў да Варгіна:

— Ну-у, ты чуеш, якую тыраду яна тут закаціла? Не бойся, ніхто нікуды цябе не выкіне!

Кашэчы кароль і не баяўся, што яго выкінуць. У гэтую хвіліну яго ўжо цікавіла зусім іншае. Ён раптам пачуў у сябе за спінаю чыёсьці надзвычай гарачае дыханне. Але ж там нікога не было. Гаспадыня стаяла каля шафы, з-пад якой ноччу выбегла мышка Паднорка. А гаспадар? Вось ён, прысеў перад ім на кукішкі. Дык хто ж гэтак горача і парывіста дыхае яму ў спіну? Нейкая нахабная істота-невідзімка! Варгін ажно закалаціўся ад злосці на самога сябе, што да гэтага часу не можа разабрацца, хто ж яна такая, гэтая таемная, выключна нябачная істота. Але разам з тым, насельнік ці насельніца кватэры. Ну так, вядома! Акрамя гаспадароў і дзяцей тут яшчэ хтосьці ёсць. Нябачнае нават яго вачам стварэнне-невідзімка.







І зусім не чалавечага яно роду. Для яго асабіста, дык проста нейкі, як і ён сам, нячысты дух. Ва ўсялякім выпадку, гэтак лічаць людзі, называючы яго нячыстым духам.

— Бедны, спалохаўся? Ты ўвесь дрыжыш,— гаспадар пагладзіў яго. Варгін зараз жа расцягнуўся на падлозе. Перакульнуўся. Падняў свае тоўстыя лапы ўгору. Ласкава завуркатаў.

— Што ж ты марудзіш? — ускрыкнула гаспадыня. — Хапай! Лёня, хутчэй хапай! Цяпер самы момант ухапіць яго!

— Валя, супакойся ты нарэшце! — сказаў гаспадар. — Шэсць гадоў жыў у нас Марс. Ты яго любіла. Нават плакала, калі ён прапаў. Дык што здарылася цяпер? Я не разумею. Табе хочацца са мною пасварыцца?

— О-о-го-го, параўнаў! — тут жа адазвалася гаспадыня: — Марсік быў разумны пяшчотны коцік. Мы ўзялі яго да сябе яшчэ сляпенькім кацяняткам. Я яго з сосачкі малаком паіла. Да таго ж ён быў гладкашэрсны! А ў гэтага поўсць якая! З жывата як ашмоцце звісае.

— Ну і што!

— Як гэта што? Мы толькі што пераехалі ў гэтую кватэру. Мы еўрарамонт зрабілі. Ты хочаш, каб тут усё было загаджана поўсцю і яшчэ чым-небудзь! А ў нас — дзеці! Ім схочацца ката на рукі ўзяць, а ён жа дзікі! Бачыў, як ашчэрыўся. Дзікі, чужы кот. Прыблудны! Ён на мяне кіпцюры выпусціў. І паглядзі, не хавае іх. Ах, божачкі! Ты толькі глянь! Ён жа паспеў ужо вушак падрапаць! Кот пачварны, што ты зрабіў з вушаком?!

Гаспадыня ў роспачы пачала рас-





ціраць драпіны ручніком. Тут і выбег са свайго пакоя дзевяцігадовы Юрасік, закрычаў радасна:

— Дзе ён? Хутчэй паказвайце, дзе кот-разбойнік, які не пабаяўся ў новай кватэры падрапаць вушак.

— Ты спачатку прывітайся, жэўжык! Дзе тваё «Добрай раніцы!»? — упікнуў Юрася бацька і адазваўся да жонкі: — Валя, у мяне, здаецца, з'явіўся саюзнік!

— Я не супраць быць саюзнікам. Я — саюзнік! Ката пакідаем у сябе! — і тут жа Юрасік падхапіў Варгіна, падкінуў угору, але злавіць яго не паспеў. Кот выгнуўся, бы акрабат, скочыў на падаконнік, і як здалося Юрасю,

падміргнуў ды яшчэ і з'едліва пасміхнуўся яму адтуль. А маці закрычала на Юрася:

— Зараз жа мыць рукі! І паспрабуй яшчэ хоць раз ухапіць яго!

— Не яго, мамачка, а Блэка. У нас быў Марс, а цяпер няхай будзе Блэк, што па-англійску азначае «чорны»! У-у, ён увесь чарнюшчы, як вугаль!

Кот зноў з'едліва пасміхнуўся, і Юрасік чамусьці збянтэжыўся, пайшоў умывацца.

— Бач, нездарма наш сын у школе англійскую мову вывучае. Зараз нам веды свае дэманструе, — адазваўся бацька. — Але ніякі кот не Блэк! Мы жывём не ў Англіі, а ў Беларусі. Ну, дык, калі мы — беларусы, значыцца, і кот у нас — беларускі. Таму ён хутчэй за ўсё проста Чарныш. Ты як, Валянціна Пятроўна? — запытаўся ў жонкі.

— Не падлашчвайся! Глядзі ты, успомніў, што я Валянціна Пятроўна! Павагу асаблівую выказаў, ці што? Мне ўсё роўна, як будзе называцца гэты кот. Блэк ён альбо Чарныш? — яна паглядзела на Варгіна, які ўсё яшчэ сядзеў на падаконніку, потым на мужа: — А-а, — махнула рукою. — Рабі што хочаш! Толькі кату на кухні не месца! Каб сёння ж ляжак які-небудзь купіў і перасяліў яго ў пярэдні пакой. — І ўжо цалкам спакойным голасам дадала: — Юрася пакармі, а я да Наташкі пайду. Ёй у садок ужо трэба збірацца.

Гаспадар зірнуў на Варгіна:

— Бачыш, Чарныш, канфлікт сам сабою ліквідаваўся! Валя, яна і някепская, ты не бойся. Вельмі нават добраю бывае. Вось і зараз пакрычала-пакрычала і аціхла. О-о, чуеш, — гаспадар кватэры ўскінуў руку. — А гэта ўжо другая ранішняя серыя. Наташка крычыць.

Кашэчы кароль натапырыў вушы.

— Не хачу ў садок! І на ката глядзець не хачу! — крычала ў дзіцячым пакоі Наташка. — Не буду я з ім



гуляць. Няхай Юрась з катом забаўляецца! Не патрэбен мне кот, я люблю Марыську! Навошта яе выкінулі?

— Мы яе не выкінулі, а пакінулі ў ранейшай кватэры, — адазвалася маці. — Марыська была старая непрыгожая лялька. Мы ж табе новую ўзамен купілі, а сёння і кот у нас з'явіўся. Сядзіць на кухні. І ведаеш, ён чорны-чорны, прыгожы-прыгожы!

— Я не люблю чорных катоў! Ніякі ён не прыгожы! — не сунімалася Наташка.

Кот Варгін саскочыў з падаконніка. Вочы яго загарэліся нядобрым агнём. У іх можна было прачытаць: «Ну пачакай, малая! Я табе яшчэ пакажу, які я непрыгожы кот!» — і ён зноў натапырыў вушы.

А гаспадар кватэры тым часам адчыніў халадзільнік, дастаў каўбасу і, перад тым як пачаць рабіць бутэрброды, адрэзаў ад кавалка некалькі скрылёчкаў.

— Гэта табе, — сказаў Варгіну і паклаў скрылёчкі ў спадачак. — Будзеш у нас дэгустатарам.

— І мне каўбаскі, — з ваннага пакоя выбег Юрасік: — Хутчэй, хутчэй! У школу спазняюся! — Ён абыякава зірнуў на ката, маўляў, не да цябе, сеў за стол.

Гэтую яго абыякавасць заўважыў Варгін, але толькі зморшчыўся. Ён без асаблівага апетыту з'еў каўбасу і, памахваючы пушыстым хвастом, пайшоў у пярэдні пакой. Асцярожна агледзеўся і ўладкаваўся пад мяккім пуфам, які стаяў ля сцяны, з адной толькі думкай, маўляў, хутчэй бы ўжо разышліся хто куды жыхары гэтай кватэры. Тады ён адразу зоймецца пошукам той істоты-невідзімкі, якая дзесьці ж тут хаваецца! А галоўнае, увесь час сочыць за ім. Ён скураю адчуваў яе прысутнасць. Гэта раздражняла і злавала яго.

А тым часам сямейнікі пачыналі разыходзіцца. Першым з кватэры выскачыў Юрасік, на хаду нацягваючы на плечы лёгкую куртачку. За ім пакінуў кватэру







і гаспадар. А вось гаспадыня затрымалася. Нарэшце, яна вывела Наташку ў пярэдні пакой, зняла з вешалкі плашчык, сунула яго дзяўчынцы:

— На, апранай. І красоўкі абуй. Мне самой хуценька сабрацца трэба. Як заўжды, апошняя збіраюся, — і гаспадыня рушыла ў спальню.

Наташка кінула плашчык на пуфік, пад якім ляжаў Варгін, сагнулася, каб узяць красоўкі, што стаялі каля пуфа. Тут яна і пабачыла ката, закрычала:

— Мама, кот пад пуфікам, а ты казала, што ён на кухні!

Маці не адгукнулася. Наташка ўважліва разглядвала Варгіна. Кот глядзеў на Наташку. Яму надакучыла на яе глядзець і ён пазяхнуў. Наташка скрывіла рот і паказала Варгіну язык:

— Бе-бе-бе-е, — падражніла яна яго.

— Цыц, табе сказалі апранацца! — нечакана агрызнуўся кот і высунуў тоўстую лапу з-пад пуфа. Зашкрабаў па падлозе. — Зараз як выскачу, будзе табе бе-бе-бе! — грозна прашыпеў ён і ледзь не мяўкнуў ад болю. Хтосьці вельмі моцна націснуў на яго лапу.

— Мама, мама, — заверашчала Наташка. — Гэты кот размаўляе. Ён мне пагражаў.

Са спальні выйшла гаспадыня, завойкала:



— Вой-вой, што за дзіця! Я ж цябе прасіла апрануць плашчык, абуцца, — яна ўхапіла Наташку, пасадзіла яе на пуфік, стала абуваць ёй красоўкі. — У мяне ўжо сіл ніякіх з табою няма. То ты рукі забываеш памыць, то абутак не на тую нагу нацягнеш, а зараз прыдумала, што табе кот пагражае. Каты не размаўляюць, яны проста мяўкаюць!



— Гэты размаўляў і мне пагражаў! — стаяла на сваім Наташка.

Варгін затаіўся пад пуфам і злёгку памахваў хвастом у глыбокім роздуме. «Зноў істота-невідзімка праявіла сябе, — думаў ён. — І якая ж сіла ў ёй тоіцца!» Ён то сціскаў, то расціскаў лапу, якая ўсё яшчэ пабольвала. Але, як толькі гаспадыня і Наташка пакінулі кватэру, ён куляю вылецеў з-пад пуфа. Для пачатку пагрозліва мяўкнуў і ўстаў на заднія лапы. Увесь яго выгляд паказваў, што кашэчы кароль гатовы да бою. Але голас быў ціхі, нават паблажлівы:

— Ну, давай, выходзь, выбягай, выскаквай, выпаўзай. Хопіць гуляць у хованкі. — Варгін агледзеўся па баках, трошкі памарудзіў і нецярпліва забарабаніў хвастом па падлозе. Ніхто не выходзіў, не выбягаў, не выскакваў, не выпаўзаў. І тады ён сарваўся з месца, імкліва заляцеў у адзін пакой, у другі, у трэці... Усё



абгледзеў, абнюхаў усе куткі, зазіраў пад канапы, пад ложкі, пад шафы — і нікога, нічога, што паказвала б на чыюсьці прысутнасць у гэтым жыллі, не знайшоў.

Фыркнуў, мяўкнуў са злосці, вярнуўся ў пярэдні пакой.

«А, можа, узяць і збегчы адсюль? Не ў маёй манеры падоўгу затрымлівацца ў чалавечым жытле, — падумаў кашэчы кароль. — Я правёў ноч у цяпле, збольшага пад'еў, ну і... бывайце, даражэнькія гаспада-





ры і дзеткі». І тут яму ўспомнілася Паднорка. Мышка-прынцэса ў сваім неймаверна зіхоткім убранні. І ўжо іншыя думкі закруціліся ў кашэчай галаве: «А што, калі яна і сапраўды аднойчы вернецца сюды? Яна ж прасіла пачакаць яе». Праўда, сама мышка мала цікавіла Варгіна. А вось вядзьмак, пра якога распавяла яна, гэта ўжо цікава! За сваё доўгае-доўгае жыццё кот неаднойчы сустракаўся з ведзьмакамі. І сярод іх адны былі так сабе, адна назва, што вядзьмак. А другія змушалі Варгіна абмінаць іх. Лепей сказаць, кашэчы кароль сам пазбягаў сустрэч з імі, таму што яны адразу бачылі, хто перад імі, і не баяліся супрацьстаяць яму. І, як аказвалася, перамога заўжды была на іхнім баку. «Хм-м, — задуменна хмыкнуў ён. — Вядзьмак-дзядок, вядзьмак-Пацук?»

Кот пацягнуўся, пашкрэбаў лапаю за вухам і палез пад пуфік, адзначыўшы, што ён выбраў для сябе не горшае месца ў гэтай кватэры.

## ПРА КЛАПАТЛІВУЮ ДАМАВУХУ І ШЛЯХЕТНАГА ДАМАВІКА

Была глыбокая ноч. І, каб гаспадыня кватэры, у якой яшчэ як след не абжыўся кашэчы кароль, нечакана прачнулася, яна вельмі здзівілася б. А магчыма, нават ускрыкнула б, пабачыўшы, што цяжкія начныя шторы на акне рухаліся, быццам нехта нябачны зашторваў акно. Адным словам, рабіў тое, што сама Валянціна Пятроўна перад сном зрабіць забылася. Зразумела, што самі па сабе шторы не маглі рухацца. Іх зашморгвала Дамавуха, каб вялізная жоўтая Поўня не зазірала ў акно.

Але гаспадыня не прачнулася. І, вядома ж, нічога не пабачыла. Ды затое Дамавуху ўгледзеў кот Варгін.





Ён зазірнуў у прыадчыненыя дзверы спальні і ажно высунуў і прыкусіў кончык языка ад здзіўлення. Так, так, кашэчы кароль быў надзвычай уражаны! Дык вось яно што! Дамавуха! Квахтуха старая! А больш дакладна, наколькі яму памяталася, лагодны дух, які спрыяе ладу ў добрай хаце. Не тое, што ён — вялікі майстар сварак ды звадак. А лепш сказаць — інтрыган, якому няма роўных! Ай-я-яй, і як жа такога маху ён даў! Як жа не здагадаўся, што гэта яна і каўбасу ў яго адняла, каб вярнуць назад у халадзільнік. І горача дыхала яму ў патыліцу, засцерагаючы сямейнікаў ад яго. І балюча на лапу яму націснула, калі ён цыкнуў на Наташку. Варгін ажно скрывіўся, калі раптам успомніў, як ён насіўся раніцай па гэтай ква-


МоРА

тэры, як патрабаваў: «Выходзь, выбягай, выскаквай, выпаўзай!» І, глядзі ж ты, не адазвалася! Можа, нават смяялася з яго няўцямнасці! Як жа такое магло здарыцца, што ён яе не пабачыў, не адчуў?! Як удалося ёй гэтак схавацца ад яго?

А што ж Дамавік? Дамавікі, наколькі ён ведае, пры любым доме найчасцей жывуць у пары з Дамавухамі, якіх яшчэ нярэдка называюць Дамахамі. І ніколі яны не варагавалі з Варгінам. Наадварот, звычайна жылі ў злагадзе з ім. Дык што ж здарылася цяпер? Чаму ён не бачыць у гэтай кватэры Дамавіка? Няўжо і Дамавік чамусьці хаваецца ад яго? Так разважаў кашэчы кароль. А Дамавуха тым часам — істота нізенькая, тоўсценькая, што бочачка, у доўгай спадніцы з шырокай фальбонаю ды ў чырвонай кофце з брыжыкамі — шчыльна занавесіла акно і хутка скіравалася да дзвярэй. Кот Варгін ледзь адскочыў, саступаючы ёй дарогу, і працягваў назіраць за ёю далей.



Дамавуха зайшла ў суседні пакой, дзе на двух’ярусным ложку спалі дзеці. На верхнім ярусе — Юрась, на ніжнім — Наташка.

— Вох-вох, — пакруціла галавою Дамавуха. — Як было на старой кватэры, так і тут. Дзіцячыя цацкі параскіданы па ўсім пакоі. Наташчына адзенне ляжыць на падлозе. Хіба ж гэтак можна! Дзеткі, вы мае дзеткі! — Дамавуха пачала ціхенька збіраць і складваць у скрыню для цацак кубікі, мячыкі, лялькі, машынкі, цацачны посуд.

Раптам на сваім ніжнім ложку заварушылася Наташка, перавярнулася на другі бачок і нечакана захныкала ў сне. Больш за тое, яна



яшчэ і некалькі разоў роспачна ўскрыкнула: «Марыська! Марыся! Мне без цябе кепска! Ты дзе? Дзе ты, Марыська?!»

— Дзе-дзе? На старой кватэры ляжыць, пакінутая, — ціхенька прабурчэла Дамавуха і прысела на краёк ложка. Папраўіла коўдру, асцярожна пагладзіла дзяўчынку па плячы, зашаптала: — Ну, не плач! Не плач, міленькая! Ты ж сама пакінула сваю Марыську. Паслухалася маці, якая сказала, каб ты не брала з сабою старую лялечку ў новае жытло. А цяпер сумуеш! Якую ўжо ноч плачаш у сне, клічаш і клічаш Марыську! Вох-вох, — цяжка ўздыхнула Дамавуха. — А я ж таксама сумую, дзетачка! Таксама плачу, ды ніхто не бачыць маіх слёзак. І казала, і прасіла Дамавіка, каб залазіў у машыну, як пераязджалі сюды, а ён заўпарціўся. Маўляў, ніхто не просіць мяне, ніхто не забірае з сабою! Вось і застаўся ў старой кватэры разам з Марыськаю. А як жа тут патрэбны ягоныя рукі! Няма каму дапамагчы гаспадару, якому трэба то мэблю перасунуць, то дыван на сцяну падвесіць! А тут яшчэ і такая напасць звалілася. Кот Варгін аб'явіўся! Твой татка ўласнаручна, сам яго ў кватэру прынёс. Ты во-о, язык Варгіну паказвала, а не ведаеш, хто сядзеў перад табою! Сам кашэчы кароль. Дамавік з ім неяк паладзіў бы. Ён з ім заўжды ладзіў, а я? Ці змагу вас усіх абараніць ад гэтай чорнай поскудзі?!

Кашэчы кароль ледзь не мяўкнуў ад такой зняваги. Поўсць на ім уздыбілася, маўляў, ну, трымайся, бабулечка, качарга ты старая! Ён ужо гатовы быў заскочыць у пакой. Але тут зноў у сне захныкала Наташка: «Марыська! Марыся! Табе кепска без мяне. Я ведаю, кепска!»

Кот памарудзіў.

— Ах, не плач, не плач, мая дзяўчынка, супакойся, — і Дамавуха паднялася з ложка. — Ну вядома! Ма-



рыся таксама недзе сумуе без Наташкі! — уздыхнула яна. — А Дамавік? Цікава, як яны там, у былой кватэры?

Дамавуха дастала з кішэнькі, прышытай да яе кофты, маленькую бутэлечку з парфумай і, як гэта звычайна рабіла Валянціна Пятроўна, мазнула за адным вухам, потым — за другім. Па дзіцячым пакоі разліўся нязвыклы, але вельмі прыемны пах. Да ўсяго такі казытлівы, што кашэчы кароль міжволі зацісну ноздры лапаю. А Дамавуха нечакана нахілілася і некалькі разоў тузанула за кутасік, які матляўся на яе мяккім пантофліку, нагадваючы заечы хвосцік. І — о, цуд! Варгін не паспеў маргнуць вокам, як яна знікла, бы растала ў начной цемрадзі. Зразумела, ён не мог бачыць, што Дамавуха ў той жа момант апынулася ў адным з пакояў ранейшага жытла. І адразу ж моцна расчхалася:

— Апчхі-і! Апчхі-і! Што тут такое адбываецца? Адкуль столькі пылу?!

— Ды рамонт у нас, хіба не бачыш? Новыя гаспадары да свайго засялення рыхтуюць пакоі, — пачуўся голас Дамавіка. І зараз жа з-пад груды запэцканых газет ды нейкіх груваcткіх каробак з'явіўся ён сам і таксама чхнуў: — Апчхі!

— Ага, чыхаўка даймае! — адазвалася Дамавуха. — А мог бы цяпер у кватэры ўтульнай палёжваць, а не сярод гэтага пылу ды смецця, шалапут ты стары! Гэта ж трэба быць такім шалапутным!

— Я не шалапутны, я — шляхетны! — хутка адказаў Дамавік і прыгладзіў сваю доўгую сівую



бараду. — Э-э, я, ведаеш, некалі ў шляхціца аднаго жыў. Мы яшчэ тады з табою не былі разам. Як ён мяне паважаў, як даражыў мною! Здаралася, нават з хлебам-соллю ў маю камору прыходзіў і лагодна прамаўляў: «Дамавік, Дамавік! Вазьмі ад мяне хлеб-соль, любі маіх коней і шануй! Я таксама буду цябе любіць і шанаваць!» Шляхціц той мяне нават у Вільню і ў Парыж неаднойчы з сабою браў. А потым, э-э, паўстанне было. І ён у чужы край мусіў назаўжды з'ехаць. Маёнтак яго на ягоную сястру перапісалі. Ну, і я не застаўся ў маёнтку. Не схацеў там жыць без шляхціца. Пачаў вандраваць! І вось тут, ужо ў гэтым стагоддзі, у гэтай сям'і раптам такая непавага да мяне! Ды гаспадыня павінна была сказаць: «Ну, давай, Дамавік, скачы ў маю сумку! Пераязджай разам з намі ў новую кватэру. Будзь нашым ахоўнікам. Вельмі прашу, бо жыццяя без цябе добрага нам не будзе!» І вось жа не сказала! А я не люблю непавагі да сябе. Таму не ўпрошвай! Не кажы, што там, адкуль ты з'явілася, цяжка без мяне. Вяртайся назад! А мы ўжо неяк з Марыськаю да пары да часу тут пабудзем!

— А дзе ж лялька? — запыталася Дамавуха.

— Ды ў пакоі другім. Усё плача і плача. Сумуе па Натцы. Не трывож ты яе! У мяне план з'явіўся. Думаю, што хутка ўсё, кхе-кхе, на сваё месца стане. Нам з Марыськаю наш новы сябра дапаможа. Паветрык! Дзіця нябесных вышыняў. Як аказалася, знаёмец мой даўнішні. Выпадкова заляцеў да нас у фортку і паабяцаў дапамагчы. Гаспадыня з'явіцца сюды, вось пабачыш. Э-э-э, з належнай павагай да мяне паставіцца!

— Угу-у, спадзявайся на Паветрыка, цягні час! Ды пакуль тут гаспадыня з'явіцца, у новым жытле ўжо кот Варгін з'явіўся!



Дамавік прыўзняў бровы. І ажно прыўстаў. Вочы яго засвяціліся цікавасцю.

— Што ты кажаш? — ён чамусьці прыцішыў голас, быццам нехта мог пачуць іхнюю гаворку. — Няўжо кашэчы кароль аб'явіўся? Няўжо зноў да людзей завітваць панадзіўся? Ну-тка, прысядзь, — і ён падсунуў бліжэй да яе вялізны караб.

Дамавуха села. Прыгладзіла фальбону на спадніцы.

— Цяпер разумееш, — плаксіва сказала яна, — што ў новай кватэры гаспадарам ды і мне нялёгка будзе. Вой, як нялёгка! Варгін ужо кіпцюры выпускае. Вочы што агонь. Зірне як маланкаю бліснe. Табе трэба перабрацца да нас. Гэта проста жыццёвая неабходнасць.



Можна сказаць, твой штодзённы абавязак, дзеля якога ты і існуеш на гэтым чужым для нас свеце.

— Ды не прычытай ты, — адмахнуўся Дамавік, — лепш скажы, а сварак яшчэ няма ў доме? Ты ж ведаеш, Варгін разлад у хату прыносіць. Усіх сямейнікаў можа перасварыць. І не сыходзіць звычайна, пакуль гаспадароў да бяды не давядзе. Дык усё ціха пакуль?

— Якое там ціха?! — узмахнула рукою Дамавуха. — Гаспадыня, як толькі пабачыла Варгіна, дык адразу ўсчала такі лямант! Так накінулася на гаспадара, што ён не ведаў, як і супакоіць яе. Ды і Наташка! Раніцу з крыку пачала, капрыз на капрызе.

— Ну, а перад гаспадарамі Варгін лісліва выгінаўся, качаўся па падлозе, ласкава вуркатаў? — дапытваўся Дамавік.

— І выгінаўся, і качаўся, і вуркатаў. Яшчэ і з халадзільніка каўбасу выцягнуў, — роспачна адазвалася Дамавуха. — О-о, ледзь не забылася! Ён з мышкі Падноркі чары зняў.

— Чары? А адкуль жа Паднорка ў кватэры ўзялася, ды яшчэ і на шостым паверсе?

— Гаспадар з лецішча яе прывёз. Выпадкова. Агідны Пацук зачараваў яе, а Варгін зняў гэтыя чары. Цяпер Паднорка зноў стала мышкаю-прынцэсаю. Я сама бачыла, — дадала Дамавуха праз паўзу.

— А дыямент на залатым ланцужку пры ёй? — запытаўся Дамавік.

— Пры ёй, пры ёй! Камень ажно вочы слепіць. На ёй і іншых каменьчыкаў шмат, а хвосцік і лапкі ў яе залатыя. — Дамавуха зірнула на Дамавіка і пацікавілася: — А ты адкуль пра гэты яе дыямент ведаеш? Даводзілася і табе бачыць Паднорку? Яна ж пры мышыным цары Паднора жыла ў глыбокіх падзямеллях.

— Ну гэтак, жыла калісьці, — пагадзіўся Дамавік. — А потым нейкі вядзьмак падманам забраў у Паднора



дыямент на залатым ланцужку, бо каменьчык гэты няпросты. Ён чарадзейны. Сіла вялікая ў ім тоіцца — і багацце, і жыццё бясконцае дае таму, хто дыямент носіць. Адным словам, усё, што хочаш: і пра мінулае раскажа, і будучыню пакажа. Вось і паслаў Паднор сваю малодшую дачку Паднорку ў харомы да ведзьмака, каб тая ўлучыла момант і скрала дыямент. Вярнула яго Паднору. Я пра гэта калісьці ад аднаго знаёмага Лазніка чуў.

— Ну і як гэта ёй удалося? — запыталася Дамавуха.

— У лазню пайшоў вядзьмак. Зняў з шыі дыямент, тут і ўхапіла яго Паднорка. Вядзьмак кінуўся за ёю, ды паслізнуўся на мокрай падлозе і ў той жа момант адубеў. Тут і з'явіўся Пацук. Але не дагнаў мышку, адно чары на Паднорку паспеў накласці.

Дамавуха зірнула на акно і падхапілася з кораба:

— Глянь, днець пачынае! Загаманілася я з табою. — На момант задумалася і запыталася ў Дамавіка: — Чуеш, а калі раптам Паднорка з'явіцца? Яна абяцала Варгіну вярнуцца ў кватэру. Як мне да яе паставіцца? Яна ж у любую дзірку ўлезе, шкоды можа нарабіць — там нешта патрушчыць, там пагрызе.

— Не турбуйся, — сказаў Дамавік. — Паднорка не вернецца. Думаю, што цара Паднора даўно ўжо няма ў падзямеллі. Ну, а тронам ягоным, напэўна, Пацук завалодаў. У яго лапы і трапіць Паднорка. І ён, як бы ёй гэтага ні хацелася, нікуды яе не адпусціць. Ды ўжо хопіць пра мышку, лепш скажы мне, як цябе Варгін успрыняў? Пра мяне не пытаўся?



— А ён мяне і не бачыў. Вось і не пытаўся пра цябе, — адказала Дамавуха і патлумачыла: — Без цябе я цяпер увесь час твой засцерагальны пярсцёнак на пальцы нашу. Ты ж мне сам яго некалі падарыў, каб ад усяго ліхога абярэгам быў, заслонай нябачнасці. Вось і стала я для Варгіна невідзімкаю. — Дамавуха пасміхнулася і дадала: — А ён ужо так насіўся па пакоях, так крычаў: «Выходзь, выбягай, выскаквай...» Я ж яму па вушах добра пляснула, як ён каўбасу з халадзільніка выцягнуў!

— А чаго ж ты цяпер без пярсцёнка? Навошта зняла яго?

Дамавуха глянула на свае рукі і ажно змянілася ў твары:

— А і сапраўды пярсцёнка няма, — яна вінавата паглядзела на Дамавіка і ціха прамовіла: — Гэта ж я шторкі начныя ў спальні ў гаспадароў завешвала, дык ён, напэўна, і саслізнуў з пальца. Такое аднойчы ўжо было ў мяне. Як толькі ўспомню пра цябе, дык нічога ўжо не чую і не бачу.

— Так-так, — чамусьці ўздыхнуў Дамавік. — А ты не ўспамінай пра мяне, а лепш рыхтуйся да сустрэчы з кашэчым каралём. Думаю, што Варгін паспеў цябе ўгледзець.

— Можа, і паспеў, — пагадзілася Дамавуха. — Ён пад пуфам у пярэднім пакоі спаў, а мог і прачнуцца, як я да дзяцей заходзіла.

— Вядома, мог, — сказаў Дамавік і павысіў голас: — Дык не стой перада мною! Табе зараз трэба як мага хутчэй у спальню вяртацца, пярсцёнак свой шукаць. — Дамавік падумаў і дадаў разважліва: — Ну, а калі ён куды і заваліўся, ці ж табе кашэчага караля баяцца? Ты — моцны дух. Мяркую, што дужэйшая за яго. Дарэчы, і я таксама дужэйшы! Нават ты са мною саўладаць не можаш. Колькі часу ўпрошваеш, каб



перабраўся ў новае жытло, а я ўсё тут і тут, кхе-кхе! На сваім стаю.

— Ну і не перабірайся! — крыўдліва выкрыкнула Дамавуха.

— Ды вяртайся ты ўжо ў спальню, — прабурчэў Дамавік. — Толькі ж глядзі, з Варгінам асабліва не цырымонься.

— А чаго гэта я з ім цырымоніцца буду? — абурылася Дамавуха. І тут жа нахілілася. Раз-другі тузанула за кутасік на пантофліку і знікла, як і не было яе ў ранейшай кватэры.

## КОТ ВАРГІН ХОЧА СУСТРЭЦЦА З ДАМАВІКОМ

Як толькі Дамавуха апынулася ў спальні, дзе яшчэ спалі гаспадары, яна адразу пабачыла свой ахоўны пярсцёнак. Ён ляжаў на дыване недалёка ад зашторанага акна. Дамавуха хуценька падняла яго і тут жа азірнулася, адчуўшы на сабе пільны, калючы позірк. Проста перад ёю, памахваючы пушыстым хвастом, стаяў кот Варгін.

— Псік, псік, нячыстая сіла! — імгненна замахала рукамі Дамавуха і пачала хуценька нацягваць пярсцёнак на палец, які чамусьці ніяк не налазіў на яго.

— Ды схавай ты гэты свой абярэг, — зларадна пасміхнуўся кашэчы кароль, — лепш пакладзі яго ў кішэньку. Ну ты даеш, бабулечка! Знайшла сабе цацку! Абы чымсьці палец упрыгожыць, ды яшчэ: псік, псік! — перадражніў ён яе. — А дзе ж тваё прывітанне? — уздыхнуў ён. — Непрыгожа. Ай, як непрыгожа! Поўная адсутнасць усялякага выхавання! Я, дарэчы, ужо







даўно застукаў цябе! Нават чуў, як ты ноччу бедавала ў дзіцячым пакоі. — Ён хітра прыжмурыў вочы: — Дык як там Дамавік у вашым ранейшым жытле маецца? Ты ж у яго была, так? Можа, ён прывітанне мне перадаў?

— Нічога ён табе не перадаваў, — адазвалася Дамавуха і нахмурыла бровы. — Зараз жа пакінь спальню. Можна падумаць, ты надта выхаваны! Згінь! Прападзі з вачэй! А лепш, увогуле, сыдзі з гэтай кватэры. — Яна сціснула кулачкі сваіх пульхных ручак і запатрабавала праз паўзу: — Прапусці! Не стой на дарозе!

І ў той жа момант Дамавуха рашуча скіравалася ў пярэдні пакой. Там яна зняла з вешалкі Наташчын плашчык, пачала яго чысціць. Кот Варгін таксама не затрымаўся ў спальні, пайшоў следам і цяпер назіраў за Дамавухаю.

— І хочацца табе гэтак завіхацца, — сказаў ён. — Во-во, гузік хутка адарвецца на плашчыку! Ды гаспадары нават не здагадваюцца пра тваё існаванне ў кватэры. А калі б раптам няўцямная гаспадыня пабачыла, хто плашчык яе дочаччы чысціць, а познім вечарам штору на акне зацягвае, я і ўявіць не магу, што было б!

— Ну і што было б? — Дамавуха павесіла плашчык на вешалку і пачала чысціць Наташчыны туфлікі. — Ты лепш падумай, што здарылася б, — адазвалася яна да Варгіна, — каб гаспадар даведаўся, каго ён у хату прынёс?! Ты мігам адсюль вылецеў бы!

— Ай, як напалохала! Можа, мне зараз слязу пусціць і роспачна мяўкнуць?

— Толькі паспрабуй! Хай яшчэ гаспадары паспяць. Залазь пад свой пуф, а лепей выбірайся за дзверы.

Кот хітра ўсміхнуўся:

— Я, можа б, і выбраўся, але давай паразважаем, — Варгін залез пад пуфік і ўжо адазваўся ад-



туль: — Наколькі я зразумеў, Дамавік пакрыўдзіўся на гаспадароў, што не дачакаўся ад іх нейкага асаблівага запрашэння ў новую кватэру? Капрызы свае паказаў. А чым я горшы? Можа, і я хачу нейкіх асаблівых адносін да сябе. Ведаеш, я калісьці жыў у пані Эльжбеты, дык яна мяне на падушачку атласную клала. А перад тым, як пакласці, падушачку парфумаю дарагою пырскала. А потым сваімі далікатнымі пальчыкамі поўсць на жываце маім перабірала і расчэсвала. Вось якія адносіны былі да мяне!

— Эхе-хе, — паківала галавою Дамавуха. — І што пасля сталася з тою пані Эльжбетаю?! Мне неяк Дамавік пра гэта расказваў. Ты яе да вар'яцтва сваім вуркатаннем давёў. Такой блытаніны ў яе галаве нарабіў, што ўсе сваякі ад сваяцтва з той паняю адмовіліся. Толькі паспрабуй якую-небудзь псоту на цяперашніх гаспадароў навесці!

— Не навяду, клянуся словам кашэчага караля. Хм-м, ведаеш, усё цячэ і змяняецца. Я, можа, паразумнеў, стаў іншым. Магчыма, цяпер я на гэтым чужым для нас свеце — самы добры кот. Хі-хі-хі, — заліўся ён дробненькім смехам, у якім чуліся здзеклівыя ноткі. — Гэткі ласкавы і пяшчотны коцік! Толькі ты больш не дыхай мне ў патыліцу, — папрасіў Дамавуху Варгін. Ён наўмысна ўмольна склаў лапы перад сабою і тут жа запытаўся: — Ты ж, напэўна, бачыла мышку Паднорку? І размову нашу, вядома ж, чула? Дык вось, дачакаюся яе, тады, можа, і знікну.

— Ага-ага, — засмяялася Дамавуха. — Чакай-чакай! Дамавіку калісьці шмат што Лазнік знаёмы пра Паднорку расказваў. Яна ніколі ўжо сюды не вернецца!





— А гэта чаму? — і Варгін не пачуў адказу на гэтае сваё пытанне.

Са спальні выйшаў гаспадар кватэры. Зазірнуў пад пуфік:

— Ну, добрай раніцы, Чарныш. Як адпачывалася гэтай ноччу? Я, бачыш, трошкі заспаў. А ты, відаць, ужо згаладаўся?

— Мяў, мяў, — лісліва адазваўся кашэчы кароль і, салодка пацягваючыся, вылез з-пад пуфа, пайшоў следам за гаспадаром на кухню.

— Сёння ў цябе будзе сухі корм, — сказаў гаспадар і насыпаў у сподачак нейкіх дробных сухарыкаў. Варгін доўга прынюхваўся да іх. Нарэшце, узяў адзін, што называецца, на зубок і адзначыў: есці можна! Пакуль еў, увесь час сачыў за Дамавухаю, якая то прышывала гузік да Наташчынага плашчыка, які вось-вось гатовы быў адарвацца. То змахвала крошкі са стала, што засталіся пасля таго, як паснедаў Юрасік. У нейкі момант яна пагразіла пальцам кашэчаму каралю і зашаптала:

— Чуў? — кіўнула галавою ў бок спальні, дзе між сабою гаманілі гаспадары. — Мабыць, твая віна! У гаспадыні з ночы разбалелася галава. Яна на гадзінку затрымаецца дома, а Наташку ў садок павядзе гаспа-

дар. Таму не разлёжвайся на кухні, ідзі пад свой пуф. І не высоўвайся. Ды глядзі, па кватэры не лётай! Я адпачыць хачу. У гардэробны пакой пайду. Там у мяне патаемны схоў, хі-хі-хі-і, мае ўласныя апартаменты.



— Пачакай, — выгнуў спіну Варгін. — Ты ж мне не адказала, чаму мышка Паднорка не вернецца сюды. Што пра яе расказваў Дамавіку знаёмы Лазнік?

— Адчапіся, — махнула рукою Дамавуха і тут жа знікла, бы растала ў паветры.

Варгін засумаваў, але пайшоў у пярэдні пакой. Яго раздражнялі галасы гаспадара і гаспадыні, а найболей хныканне капрызлівай Наташкі ды прыставанні Юрасіка. Хлопчык намагаўся выцягнуць кашэчага караля з-пад пуфа, і гэта яму ніяк не ўдавалася. Варгін быў дужэйшы, ды, каб не паказаць гэтага, раз-пораз жаласна мяўкаў: «Мяў, мяў...» Нарэшце, Юрасю надакучыла валтузіцца з катом, і ён пачаў збірацца ў школу. Варгін жа павярнуўся да сцяны, прыкрыў вуха лапаю і нечакана для самога сябе вельмі хутка заснуў.

Яму снілася мышка Паднорка. Яна бегала ў сваім казачна-зіхоткім уборы вакол вялікага валуна, на якім з паважным выглядам разлёгся кашэчы кароль, і безупынна папісквала: «Не дагоніш, не дагоніш, не дагоніш...» У нейкі момант прынцэса-мышка шмыгнула пад валун, а кот Варгін адчуў, што ён ужо ляжыць не на халодным валуне, а на цёплай атласнай падушачцы. І тут жа пабачыў маркотную пані Эль-



жбету. Яна трошкі пастаяла над ім, потым села і паклала падушачку разам з катом на калені. «Колькі ж гэта мы з табою не бачыліся, мой каток? — сказала пані Эльжбета. — Ці ж было каму тваё пузачка расчасаць? — І раптам голас яе змяніўся, у ім пачулася гідлівасць: — Псік, псік адсюль! — закрычала яна. — Нягодны кот, ды ты ў нейкім брудзе выкачаўся! Трэба ўсе вокны расчыняць пасля цябе!»

Кашэчы кароль імгненна расплюшчыў вочы. Перад ім з вялікім фенам у руках стаяла Дамавуха.

— Ну, нарэшце, прачнуўся, — прабурчэла яна. — У прыстойным жытле жывеш, а дагэтуль нямытым ходзіш.

— Дык ты гэтаю штукаю мяне памыць надумала? — з асцярогаю ўсміхнуўся Варгін. Ён з цікавасцю разглядваў фен, а Дамавуха адказала:

— Гэтаю штукаю я цябе сушыць буду. Гэта — фен, каб ты ведаў. І чуеш, не пярэч мне! Мігам ідзі ў ванны пакой, — тут жа загадала яна і пакруціла галавою: — Вох-вох-вох, як толькі такога цябе Юрасік у рукі бярэ!

— Я вылізваюся, — адазваўся Варгін і ўдакладніў: — Па дзесяць разоў на дзень. У мяне язык што наждак.

— А я сказала, ідзі ў ванны пакой! — стаяла на сваім Дамавуха.

Кашэчы кароль не спяшаўся вылазіць з-пад пуфа. Ён паглядаў раз-пораз то на Дамавуху, то на фен у яе руках. Нарэшце прамовіў:

— Ну якое мыццё! Які ванны пакой! Я, можа, сёння ў лазні памыюся. — Ён высунуў галаву з-пад пуфа і надзвычай дружалюбна звярнуўся да Дамавухі: — Чуеш, старая, мне з Дамавіком тваім сустрэцца трэба. Няхай ён мяне з тым Лазнікам звядзе, які яму пра мышку Паднорку штосьці расказваў.

— Э-э, чаго ты схацеў! А ці схоча Дамавік з табою сустракацца, ды яшчэ і з Лазнікам тым цябе зводзіць?





— Дык ты запытайся ў яго. Вось зараз жа і наведай сваё ранейшае жытло. Скажы Дамавіку, што, маўляў, так і так... З табою хоча сустрэцца кашэчы кароль, каб паразмаўляць пра Паднорку, ды і пра яго самога. — Кашэчы кароль хітра ўсміхнуўся. — Ты адпачываць у свой схоў пайшла, у свае апартаменты, а я тут пачуў, што гаспадыня гаспадару сказала. Але табе, відаць, гэта не цікава, — кот Варгін вылез з-пад пуфа і дэманстратыўна разлёгся проста перад Дамавухаю. Ён стаў павольна вылізвацца, маўляў, я ўсё сказаў. Цяпер — знікні!

Але Дамавуха не знікла, а запыталася ў кашэчага караля:

— Ну і пра што была гаворка ў гаспадароў, а лепей сказаць — у Валянціны Пятроўны з Леанідам Віктаравічам? Іх заўжды гэтак называюць суседзі, таму што паважаюць іх. Запомні гэта. — Яна трошкі памаўчала і загадала: — Хопіць вылізвацца, кажы, што сказала Леаніду Віктаравічу Валянціна Пятроўна?

— А тое, што яна ў нядзелю на старую кватэру паедзе, каб Наташчыну ляльку забраць. Сама ж чуеш, як малая плача па ёй. Гаспадыня ўжо і з новымі гаспадарамі стэлефанавалася, спыталася, ці не выкінулі яны ляльку і яшчэ нейкія рэчы.

— Навошта ты мне пра ўсё гэта расказваеш? — задумліва запыталася Дамавуха і паклала на тумбачку каля вялікага люстэрка фен, як штосьці ўжо непатрэбнае.

— Як навошта? — ажно падскочыў з падлогі Варгін. — Гаспадыня забярэ ляльку, а Дамавік так і застанецца ў ранейшай кватэры? Яна, можа, і не чула ніколі, што свайго Дамавіка трэба з сабою забіраць. А ты ўяві толькі, як Дамавік твой разгневаецца, як абурыцца, як пачне яшчэ мацней крыўдаваць! Ляльку забяруць, а да яго зноў з непавагаю паставяцца?

— Твая праўда, Варгін, — праз невялікую паўзу ціха прамовіла Дамавуха і сумелася. — Але ж Паветрык абяцаў... Дамавік спадзяецца на яго дапамогу, — яна паспрабавала суцешыць сябе.

— Што мог абяцаць Паветрык?! Ха-ха-ха, — разрагатаўся кашэчы кароль. Потым злосна мяўкнуў: — Ці ж ты не ведаеш, што Паветрык там, куды вецер падзьме. Ён ужо, напэўна, і забыўся пра сваё абяцанне дапамагчы Дамавіку. А я мог бы, я дапамог бы. У мяне ўжо такія-сякія думкі з'явіліся. Толькі ж сустрэцца з Дамавіком трэба.

— Сёння пятніца, — адазвалася Дамавуха. — Паслязаўтра нядзеля, — яна задумалася і папрасіла Варгіна. — Ты тут з Юрасікам асцярожна. Я ж ведаю твой шкодніцкі нораў. Думаеш, я паверыла, што ты мог змяніцца. Юрась ужо хутка са школы вернецца. А мне пры новых абставінах сапраўды перамовіцца з Дамавіком трэба.

У той жа момант Дамавуха сагнулася, тузанула за кутасік на сваім пантофліку і знікла так хутка, што кашэчы кароль нават хвастом не паспеў махнуць.

## ВАРГІН ПАЧУЎ АД ДАМАВУХІ ПРА ДЫЯМЕНТ НА ЗАЛАТЫМ ЛАНЦУЖКУ

Дамавуха затрымлівалася ў ранейшым сваім жытле. Са школы вярнуўся Юрасік і не адзін, а з аднакласнікам. Хлопчыкі знялі з плячэй рукзачкі, і Юрась тут жа выцягнуў з-пад пуфа Варгіна:

— Ты паглядзі, Дзяніс, які ў нас прыгажун з’явіўся! Чарныш! А цяжкі, ледзь трымаю ў руках. За адзін толькі ўчарашні дзень ад’еўся. Хочаш пагладзіць? Бацька яго ў двары на клумбе знайшоў.

Дзяніс адмоўна пакруціў галавою і нават адступіў трошкі назад.

— Не-а, — сказаў ён. — Не хачу гладзіць. Вы ж яго, напэўна, да ветэрынара яшчэ не насілі. А мая мама кажа, што ў бадзяжных катоў можа быць лішай.



— Ну, як хочаш, не гладзь, — у голасе Юрася пачулася крыўда. — Ты — чысцюлік, Дзяніска! Баішся, што Чарныш цябе запэцкае.



Юрасік запхнуў кашэчага караля назад пад пуф і сказаў прымірэнча:

— Тады пайшлі камп'ютар уключаць, пакуль нікога дома няма.

— А рукі пасля ката каму трэба памыць? — адазваўся Дзяніс, і гэта прагучала як загад. — Камп'ютар я сам уключу.

Варгін прыглушана мяўкнуў, а хутчэй, прашыпеў. «І навошта ты прывёў сюды гэтага шмэндрыка», — хацелася яму сказаць Юрасю. Ды, вядома ж, нічога такога ён не сказаў. Але ў думках моцна абурыўся. «Ну і дзеля чаго я цярплю ўсе гэтыя здзекі? — думаў ён. — Дамавік засумняваўся, што мышка Паднорка сюды вернецца. Была ж у яго калісьці пра яе размова з Лазнікам. Значыцца, нешта такое ён ведае. Пра што, напэўна, і сказаў Дамавусе. А сама Дамавуха? Колькі часу прайшло, а яе ўсё няма і няма. Можа, вырашыла, што ёй лепш у тым, ранейшым жытле разам з Дамавіком застацца? Наўрад ці новыя гаспадары таго жытла, як вось і гэтыя, дадумаюцца ўзяць з сабою свайго Дамавіка! Дык чаму б ім абаім там і не жыць пры іншых гаспадарах? Не, Дамавуха не пагодзіцца на такое. Надта ж яна да гэтых дзяцей прыкіпела. А вось мне, відаць, усё ж трэба сыходзіць адсюль, каб, чаго добрага, сапраўды да ветэрынара не пацягнулі. Гэта ж такі сорам і знявага! Ах ты, малы



нахабнік», — згадаў ён Дзяніску. І раптам Варгін зашмыгаў носам, прынюхаўся, натапырыў вушы. З гасцёўні праз прыадчыненыя дзверы даляцеў ледзь чутны лёгкі шорах і вельмі прыемны пах ужо знаёмай парфумы. Дамавуха! Ён хутка вылез з-пад пуфа, стрымгалоў кінуўся ў гасцёўню.

Кашэчы кароль не памыліўся. І як толькі пабачыў Дамавуху, тут жа хутка запытаўся:

— Дамавік чакае мяне? Ён пагадзіўся сустрэцца са мною?

Дамавуха змахнула пылінку са стала, падняла з падлогі газету, паклала яе на стол і нібыта толькі цяпер заўважыла Варгіна:

— А-а, гэта ты! Даруй, прапусціла міма вушэй. Дык пра што ты пытаешся?

— Я! Я! — кот некалькі разоў ударыў хвастом па падлозе. — Ты што, ужо нічога не чуеш? Я пра Дамавіка пытаўся. Ён будзе сустракацца са мною? Ён звядзе мяне з Лазнікам? Ты ж сама мне так нічога і не расказала пра Паднорку!

— А што пра яе расказваць? Ну, зачараваў



яе вычварны Пацук. Ну, стала яна звычайнаю шэраю мышкаю. Ты зняў з яе чары. Цяпер Паднорка зноў мышка-прынцэса. А вось ці застаўся пры ёй дыямент на залатым ланцужку, гэта невядома. Ды і сама Паднорка…

— Што сама Паднорка? — і Варгін так моцна стукнуў хвастом па падлозе, што ў гасцёўню зазірнуў Юрасік.

— Ты што, звар'яцеў, Чарныш? Брысь пад пуфік!

Варгін умомант расцягнуўся на падлозе, завуркатаў, але Юрасік ужо вярнуўся ў свой пакой. А Дамавуха паківала галавою і адазвалася да кашэчага караля:

— Хацеў, каб Юрасік палашчыў? А ты ж, Варгін, так і не памыўся! Як жа такога можна лашчыць!

— А Дамавік твой мыецца? — ухмыльнуўся Варгін.

— А як жа! — не затрымалася з адказам Дамавуха. — Штодня пад душам. Я і кашулю яго мыю, ды яшчэ і прасую яе электрычным прасам. А ён бараду сваю кожны дзень расчэсвае. У-у, — кінула яна грэблівы позірк на Варгіна. — Не тое, што ты! У цябе ж поўсць пад жыватом скруцілася ад поту і тлушчу.

— А гэта ты бачыла?! — злосна выгукнуў кот Варгін. — Можа, забылася, што я — кашэчы кароль!

Ад нечаканасці Дамавуха ціхенька войкнула. Перад ёю на задніх лапах стаяў Варгін у жоўтых штанах і цёмна-зялёным фраку, з-пад







якога выглядвалі жоўтая шаўковая кашуля і кашнэ з чорнага аксаміту. Кот падняў лапу і з напышлівым выглядам аттапырыў адзін з кіпцюроў. На кіпцюры паблісквау пярсцёнак з зялёным дыяментам. Дамавуха зноў ціхенька войкнула, але сказала надзіва паблажліва:

— Ну хопіць, хопіць, ты ж не ў Доме моды. Знайшоўся мне тут фарсун! Ці ж магла я забыцца, што ты — кашэчы кароль! Праўда, з часам стаў ты, Варгін, нейкім нездагадлівым. Можа, і сапраўды ў табе штосьці змянілася. Не здагадаўся ты, што дыямент на залатым ланцужку ў Падноркі няпросты каменьчык. Сіла чароўная ў ім тоіцца. Каму дыямент належыць, таму шмат што даецца на гэтым свеце.  З-за яго ўсё і пачалося. Стары вядзьмак падманам забраў гэты дыямент у цара Паднора. Вось цар і паслаў сваю малодшую дачку Паднорку да ведзьмака, каб тая выкрала каштоўны каменьчык. Вярнула яго назад. І аднойчы ў лазні гэта ўдалося Паднорцы. Вядзьмак пагнаўся за ёю, паслізнуўся, упаў і ўмомант сканаў. Тут з яго рота і выскачыў Пацук. Паднорку ён не дагнаў, але паспеў накласці на яе чары. Цяпер, калі Паднорка зноў стала прынцэсаю, яна, вядома ж, схацела як мага хутчэй з дыяментам вярнуцца ў роднае падзямелле да бацькі. Толькі ж Дамавік думае, што цара Паднора даўно ўжо ў жывых няма ў тым падзямеллі. Там ужо, напэўна, над усім той самы Пацук валадарыць. Вось і трапіла дзесьці да яго Паднорка. Дыямент ён, зразумела, адабраў. Ну, а Паднорка, вядома ж, стала яго нявольніцай.

І нібы іскры пасыпаліся з зялёна-жоўтых вачэй Варгіна, такім злосным агнём яны загарэліся. Ён умомант уявіў мышку Паднорку, а галоўнае, дыямент на залатым ланцужку ў яе на шыі. Значыцца, каменьчык гэты







няпросты? І цяпер ён належыць нейкаму брыдкаму Пацуку, які з'явіўся з рота памерлага ведзьмака.

— Кажы, дзе тое падзямелле? — не па-кацінаму гаркнуў ён.

— Не ведаю, — паціснула плячыма Дамавуха і хацела хуценька выскачыць у пярэдні пакой.

Варгін, ужо ў ранейшым сваім аблічччы, заступіў ёй дарогу:

— А Дамавік ведае? Ён можа сказаць мне, дзе тое падзямелле?

— Пра гэта ты ў яго самога запытаешся, — адказала Дамавуха і зноў скіравалася ў пярэдні пакой.

— Э-э-э, пачакай, — ужо больш спакойна сказаў Варгін і запусціў кіпцюры ў фальбону яе спадніцы. — Я не зусім зразумеў цябе.

— А што ж тут разумець! — адазвалася Дамавуха, злёгку тузаючы фальбону. — Дамавік усё яшчэ спадзяецца на Паветрыка, які склікаў сваіх братоў і яны гуртам падаліся ў нябесныя вышыні. Там перамовяцца з Касмічнымі струнамі. Папросяць, каб тыя струны скінулі Юрасіку на камп'ютар паведамленне.

Адным словам, раскажуць хлопчыку пра Дамавіка і яго крыўду. Ну, а Юрасік у сваю чаргу ўсё гэта перадасць сваёй маці. Гаспадыня паедзе ў нядзелю па ляльку і папросіць Дамавіка, каб ён перабраўся да іх, сюды, у новую кватэру. Можа, нават павінавaціцца перад ім. А Касмічныя струны, ведаеш, якая сіла магутная! Яны ўсё могуць. Толькі б паслухаліся Паветрыкаў.

— Ф-фь-ю-ю! — ажно прысвіснуў Варгін і зайшоўся рогатам: ха-ха-ха-а! — Ды ты ў сваім розуме, старая? Ну і кашалёў наплёў Паветрык Дамавіку, а Дамавік — табе! Якія нябесныя вышыні, якія Касмічныя струны! Ты мяне насмяшыла. Ну ўсё, ідзі! Я адпускаю цябе! І каб больш я нічога не чуў ні пра Паветрыкаў, ні пра нейкія там Касмічныя струны. У мяне ёсць свой план, я ўжо казаў табе.

Дамавуха так моцна тузанула сваю спадніцу, што ледзь не ўпала. Варгін толькі ўсміхнуўся і ціха прамармытаў:

— Дык вось як яно ўсё абарочваецца! Дыямент на залатым ланцужку — чарадзейны! У ім хаваецца сіла магутная. Хм-м, цікава. Вельмі нават цікава!

Варгін задумаўся і ўслед за Дамавухаю павольна падаўся ў пярэдні пакой. Там ён разлёгся пад пуфам і ўсё думаў, думаў... Як жа ён мог так неабачліва выпусціць мышку Паднорку з гэтай кватэры? Той самы дыямент на залатым ланцужку быў так блізенька ад яго. Хм-м, мышка-прынцэса! Толькі ж і ён сам — кашэчы кароль! І такога не можа быць, каб ён не расшукаў падзямелле, у якім цяпер можа знаходзіцца Паднорка. Але спачатку, зразумела, ён павінен перамовіцца з Дамавікам. Магчыма, якраз Лазнік штосьці расказваў яму не толькі пра мышку Паднорку, а і пра тое падзямелле, дзе яе можна знайсці. Не выключана магчымасць, што Лазнік мог ведаць, дзе яно знаходзіцца і як можна патрапіць туды. Таму цяпер трэба адно — спакойненька дачакацца нядзелі, каб, нарэшце, пабачыцца з Дамавіком.

## ФОКУС-МОКУС АД ВАРГІНА

І вось тая нядзеля настала. Раніцай, як толькі ўсе сямейнікі паснедалі, гаспадыня і гаспадар пачалі збірацца на рынак.

— Мамачка, мне клубніцаў купіце, — папрасіла малая Наташка. — Яны ўжо з'явіліся на рынку. Толькі радыскі не купляйце. Я не люблю радыску. Лепш — гуркоў.

— Купім і клубніцаў, і гуркоў, — адказала Валянціна Пятроўна: — Толькі вэрхалу ў хаце ніякага не нарабіце. Юрасік, — гукнула яна сына. І, калі Юрась выйшаў са свайго пакоя, строга сказала: — Кніжку пра Карлсана Наташцы пачытаеш. Абавязкова. Ты зразумеў мяне?

— Хай сама чытае, яна ўжо ўмее, — адмахнуўся Юрасік.

— Умее, ды не зусім, — уставіў свае слова бацька і хлопчык тут жа звярнуўся да яго:

— А мне можна ў інтэрнэт залезці, пасля таго як пачытаю Наташцы кніжку?

— Можна, можна, — дазволіў бацька.

— Толькі ненадоўга. І глядзі, каб ніякіх



мульцікаў для Наташкі. Яна іх ужо ўчора вечарам нагледзелася. Яшчэ не хапала, каб зрок сапсавала, — адгукнулася маці і тут жа папрасіла бацьку: — Сумку большую вазьмі, можа, дыванок які Чарнышу купім, дык не несці ж яго ў руках.

— Не! Дыванок не тое. Я для ката ў магазіне ляжачок аблюбаваў. Давай заўтра куплю. Не хочацца сёння ехаць у магазін, калі ўжо вырашылі на рынак паехаць. — І ён зазірнуў пад пуфік, пад якім ляжаў кот Варгін: — Чуў, як пра цябе гаспадыня клапоціцца? Дыванок табе прапанавала купіць. А як па мне, дык лепш ляжачок утульненькі, ага?

— Мяў, мяў, — адазваўся кашэчы кароль, але з-пад пуфа не вылез. Яму карцела, каб гаспадары хутчэй сышлі з кватэры. У яго не было ніякага сумнення, што, як толькі бацькі пакінуць кватэру, Юрасік тут жа засядзе за камп’ютар. А вось чым будзе займацца ў гэты час Наташка, гэта яшчэ тое пытанне! Кепска, калі возьме ў рукі кніжку ці пачне бавіцца з лялькамі. Але ўсё атрымалася так, як Варгін спланаваў яшчэ з самай раніцы. Як толькі за бацькамі зачыніліся ўваходныя дзверы, Юрась тут жа пацягнуў Наташку ў гасцёўню:

— Ну, давай, скачы на канапу, — загадаў ёй, — і кажы, які мульцік табе ўключыць?

— Спачатку пра рыжага ката-акрабата, — адказала Наташка.

— Колькі серыяў?



— Усе! Іх жа там толькі тры, — сказала Наташка.

— Мала! — уздыхнуў Юрась. — Можа, лепш пра гарэзлівага вожыка і дзікабразазадаваку? Там, здаецца, пяць серыяў. Я ж як засяду за камп'ютар, мяне не адарваць.



— Не-е! — захныкала Наташка. — Спачатку пра рыжага ката, потым пра дзікабраза.

— Добра, толькі не хныч!

Юрасік узяў пульт, уключыў тэлевізар, знайшоў патрэбны канал. І як толькі на экране з'явіўся мардасты рыжы кот на арэлях, у гасцёўню, перавальваючыся, зайшоў кашэчы кароль. Паглядзеў на Наташку, потым на Юрася і сеў перад тэлевізарам.

— Во-о, яшчэ адзін глядач з'явіўся, — пасміхнуўся Юрасік. — І цудоўна! Глядзіце тут удваіх. Толькі чуеш, Наташка, калі раптам цябе бацькі заспеюць за тэлевізарам, скажаш, што я толькі-толькі ўключыў яго. І абавязкова скажы, што мы доўга чыталі кніжку.

— Скажу, не бойся, — адазвалася задаволеная Наташка. — Ідзі да свайго камп'ютара.

Юрасік выскачыў з гасцёўні, і кот Варгін падсунуўся бліжэй да тумбачкі, на якой стаяў тэлевізар. Зрабіў выгляд, што ён уважліва ўзіраецца ў тэлевізійны экран, потым адазваўся да Наташкі:

— Ну і што ж тут цікавага ў гэтым мульціку? Кот як кот — рыжы і мардасты! Ды і выкрутасы яго слабенькія!

Наташка з апаскаю паглядзела на Варгіна, падсунулася бліжэй да спінкі канапы і ледзь чутна, быццам раптоўна страціла голас, прашаптала:

— Юра-а-ась! Мама мне не паверыла. А Чарныш зноў са мною размаўляе.

— Ну і што, — зусім блізка падсунуўся да тумбачкі кашэчы кароль. — Ты таксама са мною паразмаўляць можаш. Табе сапраўды падабаецца гэты рыжы кот, які так бяздарна гайдаецца на арэлях?

— Мне падабаецца дзяўчынка, якая сядзіць у пясочніцы, — адказала Наташка. — Усіх дзяцей мамы пазабіралі дамоў, таму што хутка пачнецца навальніца. А мама гэтай дзяўчынкі затрымліваецца. У іхняй ква-





тэры — патоп. Прарвала кран у ванным пакоі. І мама дзяўчынкі па тэлефоне выклікае майстра. А ён ніяк не ідзе. Рыжы кот забаўляе дзяўчынку. А калі пачнецца дождж, кот возьме яе за руку і завядзе дадому. Мама дзяўчынкі вельмі ўзрадуецца. А кот ім яшчэ і кран адрамантуе.

— Фь-ь-ю-ю, майстар вялікі знайшоўся! Бачыш ты, ён кран адрамантуе. А хочаш, я пакажу табе фокус-мокус? — Варгін запытальна зірнуў на Наташку і дадаў: — Навошта глядзець тое, што ўжо неаднойчы бачыла?

Пасля гэтых сваіх слоў кашэчы кароль падняўся на заднія лапы і перапытаў:

— Дык ты хочаш пабачыць фокус-мокус?

— Хачу, — прашаптала Наташка.

Кашэчы кароль азірнуўся і ўгледзеў тое, чаго не бачыла Наташка. Ну, вядома ж, за Варгінам пільна сачыла ўстрывожаная Дамавуха. Яна стаяла каля прыадчыненага акна і нервова пераміналася з нагі на нагу.

— Ну і што ж ты такое задумаў, Варгін? — запыталася Дамавуха ў кашэчага караля, і яе голас для Наташкі застаўся за заслонай нябачнасці.

Варгін жа, зразумела, пачуў Дамавуху, але ў адказ толькі ўзмахнуў хвастом, маўляў, не назаляй, старая, і працяжна праспяваў:

— Фокус-мо-о-кус! Фокус-мо-о-кус! Зараз будзе фокус-мо-о-окус! Пасля чаго ён імкліва скочыў на панэль тэлевізара. Дзіўна, але тэлевізар нават не пахіснуўся. А сам Варгін ужо загадкава ўсміхаўся Наташцы з тэлевізійнага экрана, пачухваючы лапаю за вухам.

Рыжы кот на арэлях перастаў гойдацца. Ён з цікавасцю паглядаў на Варгіна. Грымнуў гром. Бліснула







маланка. І закрапалі буйныя кроплі дажджу. У пясочніцы заплакала дзяўчынка. Рыжы кот прыціснуў вушы да галавы, моцна гайдануўся і імкліва скочыў у пясочніцу. Кашэчы кароль тут жа апынуўся на арэлях. І ў той жа момант ён застаўся на экране адзін. Рыжы кот і дзяўчынка зніклі.

Наташка амаль уціснулася ў спінку канапы.

— Юрась, Юра-а-ась, наш Чарныш у тэлевізары, — прашаптала яна.

— Сціхні, малая! — прыкрыкнуў з экрана на Наташку Варгін і сказаў больш спакойна: — Сядзі ціха, слухай мяне ўважліва. Потым пра ўсё пачутае раскажаш сваёй маці, шаноўнай Валянціне Пятроўне. Я — кашэчы кароль. Караля трэба слухацца. — Ён зрабіў паўзу, звузіў свае зялёна-жоўтыя вочы, уздыхнуў: — Эхе-хе-е, разумееш, на старой кватэры разам з вамі жыў Дамавік. Не той Дамавічок, які бывае ў казках, а самы сапраўдны — дзед Дамавік з доўгай сівою барадою. Ты мне можаш не паверыць, але гэта — праўда! Так-так! — Ёнківаў галавою. — Здаўна-здаўна ўжо гэтак павялося, што пры дамах жывуць Дамавікі, а пры хатах — Хатнікі. Нават



Лазнікі жывуць пры лазнях. Ваш Дамавік быў вельмі добры. Адным словам, дух не шкодны. А бываюць духі шкодныя, але я зараз не пра іх, а пра Дамавіка. Чуеш, малая, ён ахоўваў вас ад усяго кепскага і ўва ўсім спрыяў вам. Нават татку твайму неаднойчы скрытна дапамагаў, пра што той нават не здагадваўся. І што ж у выніку атрымалася?! — Варгін з роспачным выглядам развёў лапамі. — Вы ўсе пераехалі сюды, у новае жытло, а Дамавіка пакінулі ў старой кватэры? Кепска, малая! — Кашэчы кароль відавочна быў надта задаволены сваім красамоўствам. — Гэта вельмі нядобра! Адна справа, ляльку старую пакінуць, а другая — Дамавіка! Дамавік пакрыўдзіўся, вельмі моцна ён пакрыўдзіўся!

— Мы сёння з мамаю паедзем на старую кватэру, — адгукнулася Наташка. — Мы забяром адтуль Марысю. Яна мая любімая лялька.

— Вось-вось, любімая лялька! Ведаю, што паедзеце на старую кватэру, каб забраць яе, — сказаў Варгін і тут жа запытаўся: — А Дамавіка свайго? Яго таксама трэба ўзяць з сабою. Ён жа любіў вас усіх, дык каго цяпер любіць ён будзе? Вядома, Дамавік можа прыжыцца пры новых гаспадарах,





але ці палюбіць ён іх?! Ён жа па вас сумаваць увесь час будзе, як і зараз сумуе разам з Марысяю. Дык, чуеш, малая, свайго Дамавіка вы сёння павінны запрасіць да сябе, у гэтую кватэру. Хай твая маці, шаноўная Валянціна Пятроўна, ласкава папросіць яго, каб ён зноў жыў разам з вамі. Хай скажа, што вам тут дрэнна без яго. А калі не папросіць, калі не скажа, дык ведаеш, што вам усім будзе? Сказаць табе, малая, што можа здарыцца, у-уў, у-уў? — працяжна завыў кашэчы кароль, рэзка ўскінуў тоўстую чорную лапу, быццам хацеў некага шкрабануць, і звузіў вялікія зялёна-жоўтыя вочы. Праўда, больш нічога ён не паспеў сказаць. Таму што якраз у гэты момант рыпнулі ўваходныя дзверы, пачуліся галасы. У пярэдні пакой увайшлі Валянціна Пятроўна і Леанід Віктаравіч.

— Мама-а! — нема закрычала Наташка і мігам усхапілася з канапы. Але хуценька зноў апусцілася на яе, уціснуўшы галаву ў плечы. Проста над ёю стрымгалоў праляцеў Варгін. Ён з усяго разбегу скочыў на шыбку прыадчыненага акна і ўмомант знік за ім.

— Што здарылася, Наташка? — у гасцёўню зазірнула Валянціна Пятроўна і зараз жа рукою паказала на тэлевізар: — А гэта што яшчэ такое?! Я прасіла, каб не ўключалі мульцікаў!

Наташка зірнула на экран, дзе ўжо не накрапваў дождж, а шумеў сапраўдны лівень, пад якім рыжы мардасты кот за руку вёў малую дзяўчынку да пад'езда высокага жылога дома.

— Я толькі-толькі пачала глядзець мульцік, мамачка, — сказала Наташка і захныкала. — І-і-і, я зусім мала

паглядзела, таму што наш Чарныш заскочыў у тэлевізар, і з экрана я пачула ад яго, што ён — кашэчы кароль. Потым ён пачаў мне расказваць пра Дамавіка, які жыў разам з намі на старой кватэры. Кот сказаў, што мы павінны забраць Дамавіка сюды, як пойдзем сёння з табою на старую кватэру па Марысю. А перад тым як заскочыць у тэлевізар, Чарныш запытаўся ў мяне, ці хачу я пабачыць фокус-мокус, — і Наташка паглядзела на Юрася, які якраз у гэты момант з'явіўся ў гасцёўні.

— Ну і што ты такое тут расказваеш? Што прыдумляеш! — Юрась імгненна пайшоў у наступ. — Ты лепш раскажы, як доўга я чытаў кніжку пра Карлсана, а потым табе надакучыла гэтае чытанне і ты папрасіла ўключыць толькі адну серыю пра ката-акрабата.

— А ты, Юрасік, не ўмешвайся. Я пра Чарныша расказваю. Чарныш прагнаў рыжага ката з арэляў, — Наташка зноў захныкала і пажалілася: — Ён сказаў, што калі мы з мамаю сёння са старой кватэры не возьмем з сабою свайго Дамавіка, дык нам усім тут вельмі кепска будзе. Ён з экрана трос лапаю. Ён пагражаў.

Валянціна Пятроўна падышла да Наташкі:

— А ці не захварэла ты часам, дочачка мая, — яна памацала Наташчын лоб і паціснула плячыма: — Не, тэмпературы няма!

— А-а, вось што! — адазваўся Юрась: — Мама, я ведаю, у чым справа. Напэўна, з'явілася чацвёртая серыя пра ката-акрабата. Іх жа ўсяго было толькі тры. А ў школе нехта казаў, што неўзабаве з'явіцца і чацвёртая. Потым — пятая. Вось новая серыя і з'явілася! У ёй рыжы кот пасябруе з чорным катом, які такі чорны, як наш Чарныш! — І Юрасік запытаўся ў сястры: — Наташка, ты не брала пульт? Ты нічога не пераключала?!

— Не-а, — капрызліва надзьмула губкі Наташка. — Я хачу, каб мы разам з Марысяю са старой кватэры забралі свайго Дамавіка.



— Валя, ты чула? — у гасцёўню зазірнуў Леанід Віктаравіч. — Талковыя мультфільмы пачалі паказваць дзецям. — Помню, у дзяцінстве мой дзед прыбудовачку да дома рабіў. Дзве сцяны за дзень з цэглы выклаў. А раніцай выйшаў у двор і дзіву даўся: «Няўжо гэта я сам усё зрабіў? Во-о як пастараўся!» А бабуля яму ў адказ: «Гэта табе, напэўна, наш Дамавік дапамог!» Яна таму Дамавіку штовечар у сенцах малачка з даёнкі ў сподачак налівала. — Ён паглядзеў на Наташку і пасміхнуўся: — Ты, Валя, слухайся нашу дачушку. Не ўзялі мы з сабою свайго Дамавіка, як пераязджалі сюды, дык трэба сёння яго забраць, папрасіць, каб і ў гэтай кватэры ён жыў разам з намі. Ты як думаеш, Юрась? — перавёў ён позірк на сына і тут жа запытаўся: — А дзе ж гэта наш Чарныш? Ні на кухні, ні пад пуфам — я нідзе яго не пабачыў. Напэўна, ён у вас тут недзе, у гасцёўні. Я ўсё ж паслухаўся маці. Купілі мы яму дыванок.

— А Чарныш, як толькі вы з мамаю зайшлі ў кватэру, адразу выскачыў з тэлевізара і на акно скочыў, — сказала Наташка.

— Дык яно ж прыадчыненае! Я сама яго прыадчыніла, як ішлі на рынак, каб пакой праветрыўся, — захвалявалася Валянціна Пятроўна і падышла да акна. — Кот мог выскачыць!

— Ён і выскачыў, — усё яшчэ капрызліва адазвалася Наташка. — Скочыў на акно і знік за ім.

— Ну і што цяпер? Навошта было прыадчыняць вакно! — Леанід Віктаравіч устрывожана пазіраў то на дзяцей, то на Валянціну Пятроўну. — Усё, лічыце, няма ў нас коціка! У нас жа шосты паверх! — Ён увайшоў у гасцёўню і хутка падаўся да акна, выглянуў з яго: — Ого-го-о, вышыня — не жартачкі!

— Думаеш, мог разбіцца? — разгублена запыталася Валянціна Пятроўна.



— Я недзе чытаў, у нейкай кніжцы, што каты не разбіваюцца, — сказаў Юрасік. — У катоў пругкія лапы. Каты мякка прызямляюцца.

— Ну, калі мякка прызямляюцца, бач, які ты разумны, — павысіў голас бацька, — дык бяжы ў двор і шукай Чарныша. Ён наўрад ці паспеў збегчы з двара, а вось у якія-небудзь кусты з перапуду мог забіцца. Дарэчы, Юрась, у тым, што здарылася, ты вінаваты. Табе сказалі чытаць Наташцы кніжку, а ты ўключыў тэлевізар! Акно было прыадчыненае, ты яго не зачыніў! А павінен быў зачыніць, без бацькоў ты застаешся ў доме за старэйшага.

— Я на акно не глядзеў, — адгукнуўся Юрась ужо з пярэдняга пакоя. — Пайду пашукаю, можа, і знайду ката! Толькі клубніцаў мне пакіньце! — папрасіў ён і імкліва выскачыў за дзверы.

— Ну, так, — цяжка ўздыхнуўшы, зачыніла акно Валянціна Пятроўна. Яна падышла да канапы, узяла пульт і выключыла тэлевізар, дзе ўжо заканчвалася трэцяя серыя пра ката-акрабата. — Чарныша можна зразумець. У тэлевізары ён пабачыў пясочніцу, дзяўчынку, рыжага ката, дрэвы, і яму схацелася на волю. Не схацеў у чатырох сценах жыць. Вось і сігануў у акно! Хоць бы ўжо гэты кот знайшоўся. Я пачала прывыкаць да яго. — І яна зноў цяжка ўздыхнула.





## ПРА ГАРЭЗЛІВАГА ПАВЕТРЫКА І САЛАМЯНЫ КАПЯЛЮШ

Кашэчы кароль, заплюшчыўшы вочы, ляжаў на разлапістай галіне высокага каштана і час ад часу чухаў то за адным вухам, то за другім. У вушах нясцерпна шумела і пабольвала. «Бр-р-р», — паматаў ён галавою і падумаў, што нялёгка далася яму гэтая вандроўка ў тэлевізар. Праз сцяну ды праз халадзільнік праходзіць значна лягчэй. І яшчэ Варгін пашкадаваў, што так нечакана нават для самога сябе выскачыў з кватэры і яму невядома, што ж там цяпер адбываецца?! Расказала Наташка бацькам пра Дамавіка ці не? І як жа яны ўспрынялі ўсё тое, што маглі пачуць ад дачкі? Але вось ён злёгку павёў вухам, прынюхаўся і тут жа расплюшчыў вочы. Хуценька разгарнуў лапчастае лісце. У той жа момант расчыніліся ўваходныя дзверы і з пад'езда дома, каля якога рос каштан, выбег Юрасік.

— Кіс-кіс-кіс, Чарныш! Кіс-кіс! — Хлопчык імкліва збег з ганка і падаўся да кветніка. Уважліва абгледзеў

клумбу, на якой раслі густа пасаджаныя цюльпаны. Потым падбег да куста бэзу: — Кіс-кіс-кіс, Чарныш!

Кашэчы кароль ухмыльнуўся, маўляў, ага-а, вось яно што? Юрась шукае яго! Значыцца, усё не так і кепска. На яго думку, гаспадары ўспрынялі тое, што магла расказаць ім малая Наташка, як кажуць цяпер, не зусім адэкватна. Яны не паверылі ёй, што кот залез у тэлевізар і з экрана расказаў Наташцы пра Дамавіка. І цудоўна, што не паверылі! Галоўнае, што пра Дамавіка ад малой яны пачулі. А сучасныя людзі, як і ранейшыя ў даўнія-даўнія часы, застаюцца неабыякавымі да ўсяго таемнага. Яны ў большасці — прымхлівыя. Быць не можа, каб гаспадыня не паспяшалася забраць з цяпер ужо чужой для яе кватэры свайго Дамавіка. Якраз гэтак і задумваў Варгін. Ва ўсялякім выпадку, на гэта разлічваў.

— Кіс-кіс-кіс, Чарныш! — ужо чулася ад куста язміну.

«А, можа, узяць і спусціцца з дрэва? Няхай мяне знойдзе Юрасік, — падумаў кашэчы кароль. — Усё роўна трэба будзе вяртацца ў кватэру, каб пра ўсё, што там адбывалася без мяне, пачуць ад Дамавухі».

Але Варгін не спусціўся з дрэва. Вырашыў трошкі памарудзіць, бо Юрасік неяк вельмі раптоўна кінуўся да пад’езда і хуценька сеў на лавачку, якая стаяла пад каштанам. Кашэчы кароль не ведаў таго, што даволі часта менавіта ў гэты час хлопчык садзіўся на гэтую лавачку.

Справа ў тым, што з хвіліны на хвіліну ў двары павінна была з’явіцца Ларыска, Юрасікава



аднакласніца — задавака з задавак, якую хлопчык не пераносіў! І разам з тым часта выбягаў з пад'езда, садзіўся пад каштан, каб яшчэ і яшчэ раз прадэманстраваць Ларысцы сваю абыякавасць. Ва ўсялякім выпадку, так яму здавалася. Ларыска рабіла тое ж самае. Вось і цяпер, як толькі яна заўважыла Юрасіка, дык імгненна адвярнулася. Паправіла на галоўцы новы саламяны капялюшык і хуценька рушыла да суседняга пад'езда, размахваючы невялікім партфелем, у якім ляжалі ноты. У суседнім пад'ездзе жыла настаўніца музыкі, да якой некалькі разоў на тыдзень і прыходзіла Ларыска. Дзяўчынка ўзбегла па прыступках, гучна зачыніла за сабою дзверы пад'езда.

Кашэчы кароль на сваёй галіне хітра заўсміхаўся: «Нічога сабе! Во-ох, як расхваляваўся Юрасік пры з'яўленні гэтай дзяўчынкі! — Ён тут жа скеміў: — Дзяўчынка падабаецца хлопчыку. Іншымі словамі, ён неабыякавы да яе!» А Юрась у гэты самы момант успомніў, як учора ў школьным буфеце ён хацеў падаць Ларысцы шклянку з кампотам, а яна толькі фыркнула ў адказ. І адразу ж папрасіла падаць кампот Валерку, з якім сядзела за адной партай. Вух, як жа хацелася Юрасіку тады падставіць Валерку падножку! Ён ледзь стрымаў сябе.

«Больш ніколі нават не падыду да яе ў буфеце», — падумаў Юрасік і падняўся з лавачкі. У гэты момант ён і пачуў голас:

— А дзяўчынка сёння не будзе займацца музыкай.

Хлопчык зірнуў уверх, адкуль чуўся голас, у непаразуменні паціснуў плячамі і на ўсякі выпадак запытаўся:

— А ты адкуль пра гэта ведаеш?

— Я не ведаю, але добра бачу са сваёй галіны. Дзяўчынка зайшла ў кватэру, і тут нехта патэлефанаваў настаўніцы. З-за гэтага званка яна, відаць, і адмяніла

ўрок. Цяпер настаўніца штосьці дыктуе, а дзяўчынка хутка запісвае ў сшытак.

Юрасік глядзеў уверх і нікога не бачыў між голля. Таму зноў запытаўся:

— А ты хто? Як ты можаш з галіны праз акно бачыць настаўніцу і Ларыску, калі я цябе на каштане не бачу?!

— Ты і не можаш мяне пабачыць сярод густога лісця, — пачулася ў адказ. — Я — Паветрык, самы лёгенькі дух. Адны духі жывуць у бутэльках, іншыя — у закінутых дамах, пад печчу ці ў каморах, а я — на галіне! Зразумеў?

Юрасік задумаўся. У пачутае верылася з цяжкасцю. Пра самых розных духаў ён чытаў толькі ў казках. І ўсё ж вырашыў удакладніць:

— І што, ты ўвесь час жывеш на гэтым каштане?

— Ды я тут выпадкова, — адазваўся Паветрык. — Мы, Паветрыкі, звычайна лётаем у паветры гуртам. Я лётаў з братамі і пачаў залішне выдурняцца. Яны абазвалі мяне дуронікам і пакінулі на галіне гэтага каштана. Сказалі, каб я чакаў іх тут. Самі ж паляцелі ў нябесныя вышыні, дзе хочуць перамовіцца з Касмічнымі струнамі, каб тыя дапамаглі адной добрай істоце.

Кот Варгін ажно падскочыў і ледзь не зваліўся са сваёй галіны: што ён чуе! Паветрыкі, нябесныя вышыні, Касмічныя струны і нейкая адна добрая істота? Ну, вядома ж, гэтая істота — Дамавік! Пра ўсё гэта ён ужо чуў ад Дамавухі. Дык гэта, напэўна, і ёсць той Паветрык, які ўзяўся дапамагчы Дамавіку.

Кашэчы кароль асцярожна разгарнуў перад сабою лісце і паглядзеў уніз. Але тут жа міжволі адхінуўся. Проста перад ім, бы прыклееная да даволі тонкай галіны, пахісталася надзвычай празрыстая мыльная бурбалка. Толькі ж Варгін надта добра ведаў, што гэта — не бурбалка! А, вядома ж, той самы Паветрык, які толькі што размаўляў з Юрасікам. І калі добра прыгледзецца, дык



і не такі ўжо ён быў зблізку празрысты. Больш таго, на яго авальным тулаве бачыліся вельмі выразныя маленькія крылцы, з-пад якіх вытыркаліся даволі тоўсценькія лапкі. Іх можна было параўнаць з адросткамі невялічкага кактуса, столькі дробных калючак было на іх.

Тут трэба сказаць, што кату Варгіну даводзілася і раней сустракацца з Паветрыкамі, толькі ж тады ён назіраў за імі здалёк. А каб вось так, бачыць зусім блізенька, такога яшчэ не было. Таму ён з вялікай цікавасцю разглядваў гэтую дзіўную істоту. Юрасік жа, як ні стараўся штосьці разгледзець між лісця, нічога не бачыў. Але яму вельмі хацелася распытаць у Паветрыка і пра Касмічныя струны, і пра нейкую добрую істоту. Таму ён і крыкнуў:



— Гэ-эй ты, на галіне, ты мяне чуеш?!

І тут з суседняга пад'езда выйшла Ларыска. Хлопчык усхапіўся з лавачкі і зноўку сеў. Ён так расхваляваўся пры з'яўленні дзяўчынкі, што ўмомант забыўся пра Паветрыка, але той нагадаў пра сябе сам. І ўжо не з галіны, а зусім побач Юрасік пачуў яго шэпт:

— Чую цябе, чую, не крычы. Браты паляцелі ў нябесныя вышыні, каб дапамагчы адной добрай істоце, а мне хочацца дапамагчы табе. Ты не супраць?

Юрасік пацінуў плячыма. Ён не ведаў, што адказаць Паветрыку, адно глядзеў на Ларыску. А дзяўчынка ўжо саскочыла з апошняй прыступкі ганка. І тут раптам нейкая сіла (а гэта ж, вядома, быў Паветрык) сарвала з яе галавы саламяны капялюшык і панесла, закруціла яго ў паветры. Ён то ўзнімаўся ўверх, то апускаўся і ўсё далей і далей адлятаў ад Ларыскі.

— Ай-яй, — крычала дзяўчынка. — Мой капялюш! Мой новы саламяны капялюшык! — і яна проста

ўзмалілася: — Юрась! Юрасік! Ну дапамажы ж ты мне! Хіба не бачыш, я ніяк не магу яго ўхапіць! Вецер сарваў з галавы капялюшык.

І Юрасік пабег за капелюшом, які ў нейкі момант нібыта застыў у паветры. Тут яго і ўхапіў Юрасік. Калі ён аддаваў капялюшык Ларысцы, яна з захапленнем глядзела на хлопчыка і ўсё прамаўляла, прамаўляла:

— І як табе ўдалося? Як удалося? Калі б не ты, немаведама дзе зараз быў бы мой капялюш! Можа, на дрэве, можа, на даху дома. Ты цяпер самы лепшы мой сябар. А хочаш, трошкі пасядзім разам пад каштанам на лавачцы?



Юрасік радасна кіўнуў галавою, і яны пайшлі да лавачкі. А Паветрык у гэты момант ужо апусціўся на каштан. Ён уладкаваўся на раней шай галіне і думаў: «А мы, відаць, не такія ўжо і ліхія духі, якімі звычайна нас лічаць людзі. Браты, напэўна, ужо дзесьці размаўляюць з Касмічнымі струнамі. Вырашаюць, як лепш дапамагчы адной добрай істоце. А я дапамог хлопчыку пасябраваць з дзяўчынкай, якая, відно, яму ўжо даўно падабаецца. Хм-м, вецер? Я аказаўся мацнейшым за яго!» — І нечакана нават для самога сябе Паветрык з замілаваннем паглядзеў уніз, на тую самую лавачку пад каштанам, дзе сядзелі Юрасік і Ларыска. Але тут жа вымушаны быў азірнуцца і закрычаць:

— Э-э, ты чаго? Мне ж баліць!

— Зразумела, баліць! — не стаў пярэчыць Варгін, які паспеў перабрацца на галіну да Паветрыка. — Я ж уваткнуў у цябе свой кіпцюр!

І замест таго, каб абурыцца, Паветрык раптам радасна выдыхнуў:

— Кашэчы кароль!? Я пазнаў цябе! Ага-а, пазнаў! Прывітанне! Рады бачыць! Ты адкуль тут узяўся?!

— Адкуль, адкуль?! — прабурчэў кот Варгін. — Не выплюхвай на мяне сваіх эмоцый! Лепш скажы, пра якую добрую істоту ты тут згадваў? А-а? Ці не пра Дамавіка?



— А ты адкуль ведаеш, што пра Дамавіка? — пытаннем на пытанне адказаў Паветрык. — Разумееш, я неяк адбіўся ад свайго гурту і выпадкова заляцеў да Дамавіка ў фортку. Ён папрасіў дапамагчы яму. Кажуць, што мы — ліхія, а людзі таксама бываюць нядобрымі. Адна гаспадыня не запрасіла Дамавіка ў сваё новае жытло. Ён моцна пакрыўдзіўся. Яму вельмі хочацца быць запрошаным.

— Далей можаш не расказваць. Я пра ўсё гэта ведаю. Чуў ад Дамавухі — Дамавіковай жонкі. Толькі ж

не верыцца мне, што твае браты дабяруцца да Касмічных струнаў. Іх даўно ўжо вецер мог збіць са шляху.

Паветрык хацеў запярэчыць, але кашэчы кароль прыклаў лапу да рота:

— Цс-с-с, маўчы!

Яго ўжо мала цікавіў Паветрык, таму што з пад'езда выйшлі Валянціна Пятроўна і Наташка. Юрасік тут жа падхапіўся з лавачкі:

— Ма-а-ам, Чарныша нідзе няма. Я ўсё добра абгледзеў каля пад'езда.

— А каля суседніх пад'ездаў? — адазвалася Валянціна Пятроўна, і яны з Наташкай прыпыніліся каля лавачкі.

— Добры дзень, Валянціна Пятроўна, — Ларыска хуценька саскочыла з лавачкі і сказала: — Я дапамагу Юрасю. Ён мне расказаў, што ў вас здарылася. Мы будзем разам шукаць ката.

— Во-во, правільна! Шукайце! Кот мог так сігануць з перапуду, што ўжо можа дзесьці за домам схаваўся.

— Мы і за домам пашукаем, — запэўніла Валянціну Пятроўну Ларыска.

— А мы едзем з мамаю на старую кватэру! Ага-а, едзем, — пахвалілася Ларысцы малая Наташка. — Забяром адтуль маю ляльку Марысю. І Дамавіка свайго возьмем. Ён будзе зноў жыць у нас, разам з намі. Праўда, мама?

— Праўда, праўда, Наташка, — адказала Валянціна Пятроўна. Яна ўзяла малую за руку і паглядзела на Юрася: — Ну, мы пайшлі, а вы тут не расседжвайцеся! Каля кожнага пад'езда ўсё добра абгледзьце. І за домам таксама пашукайце. Такі коцік быў, такі ласкавы, разумны коцік! — пакруціла яна галавою. — І па падлозе пакачаецца, і павуркоча. Ты ўжо пастарайся, сынок, знайдзі Чарныша.

— Ах, я зараз проста расплачуся. Так і хочацца мяўкнуць, — прашаптаў Варгін і правёў позіркам

Валянціну Пятроўну і Наташку, якія ўжо адышлі ад лавачкі.

— Навошта табе мяўкаць, там жа нейкага Чарныша шукаюць, — адазваўся Паветрык.

— Ага, Чарныша, — пагадзіўся з Паветрыкам кашэчы кароль. — А ты пра галоўнае чуў? — і бы працяў, так бліснуў ён зялёна-жоўтымі вачамі. — Гаспадыня сёння забярэ свайго Дамавіка са старой кватэры. Гэта тая самая гаспадыня, на якую пакрыўдзіўся Дамавік. Твае браты дарэмна падаліся ў нябесныя вышыні. Усё, што трэба было зрабіць, зрабіў я! Угу-у, угу-у, не здзіўляйся! Я дапамог Дамавіку.

— А я і не здзіўляюся. Ты ж — кот Варгін! Ты шмат што можаш! Вунь як балюча кіпцюр свой у мяне ўсадзіў! Хто на такое асмеліўся б! — і на ўсялякі выпадак Паветрык трошкі адсунуўся ад ката Варгіна, запытаўся: — Дык і цябе Дамавік прасіў дапамагчы яму?

— Не, не прасіў! Я па ўласным жаданні дапамог яму. Проста мне пабачыцца з ім трэба. Разумееш, хачу адшукаць мышку Паднорку. Дакладней, тое падзямелле, дзе яна можа быць.

— Ты шукаеш мышку-прынцэсу? — паварушыў крылцамі Паветрык, быццам размінаў іх, рыхтуючыся да палёту. — А навошта табе сустракацца з Дамавіком?

— Доўга расказваць, — пачухаў за вухам Варгін. — Ну, а калі ў некалькіх словах, дык хачу запытацца, ці ведае ён, дзе тое падзямелле, у якім можна знайсці мышку Паднорку. Падказка яго патрэбна. Дамавіку шмат пра Паднорку Лазнік расказваў. І ўвогуле, разумееш, Дамавікі — істоты дасведчаныя. Яны ўвесь час пры людзях жывуць. У іхняй памяці шмат чаго хаваецца. Я ў гэтым неаднойчы пераконваўся.



— Вось-вось, пры людзях жывуць! — адгукнуўся Паветрык. — А людзі дзе? У дамах ці ў хатах! Дык Дамавік пра Хатнікаў можа шмат што ведаць, ці, скажам, пра Хлеўнікаў, альбо тых жа самых Лазнікаў. А пра падзямеллі ён нічога не ведае. Гэта чужы для яго свет. Так, ён мог нешта чуць пра мышку Паднорку, а дзе, у якім яна падзямеллі, наўрад ці падкажа. Тут трэба ў некага іншага папытацца.

Кашэчы кароль слухаў Паветрыка і вадзіў вушамі то ў адзін, то ў другі бок, адкуль гучалі галасы Юрасіка і Ларыскі:

— Кіс-кіс, Чарныш! Кіс-кіс-кіс! Мы цябе да ветэрынара занясём, калі ты раптам лапкі пашкодзіў! Кіс-кіс, Чарныш!

Варгін ляжаў на галіне і толькі моршчыўся. А пры слове «лапкі» нават гучна фыркнуў і з усяе сілы дзерануў тоўстаю чорнаю лапаю па галіне. Пры гэтым падумаў: «Ведалі б вы, дзеткі, якая гэта моцная лапа! Магчыма, тады б ні пра якага ветэрынара тут і не згадвалі!» А ўслых ён адазваўся да Паветрыка:

— У цябе ёсць прапановы? Калі не Дамавік, дык хто можа ведаць, дзе, у якім падзямеллі трэба шукаць Паднорку?!

— Русалкі! — хутка выпаліў Паветрык. — Яны па збажыне бегаюць. Любяць качацца ў жыце. А там жа — норы, у якіх мышкі-палёўкі жывуць. А яны, гэтыя мышкі, хто такія? Кеміш? Няхай і далёкія, а ўсё ж сваячкі Паднорკі! Мне даводзілася бачыць, як русалкі нярэдка забаўляюцца з палёўкамі.

— Дык жа і русалак знайсці трэба, — у голасе ката Варгіна чулася няўпэўненасць.

— Даверся мне, — падбадзёрыў кашэчага караля Паветрык. — Я з братамі, перад тым як адправіцца ў гэты свой палёт, адпачываў у балотцы каля адной глыбокай вірлівай рэчкі. Дык, чуеш, недалёка ад бе-



рага бачыў маладзенькую Русалку. Сядзела на дрэве. Валасы свае доўгія расчэсвала. Можам паляцець туды. Тым больш што якраз вецер у той бок дзьме. — І Паветрык праз невялікую паўзу запытаўся: — Ну дык ты як? Згодны? Ляцім?!

І нечакана для Паветрыка, без усялякіх лішніх пытанняў, кашэчы кароль пагадзіўся.

— Ляцім! — сказаў ён. — Толькі ж ты глядзі, не збіся са шляху.

— Не саб'юся, — запэўніў Паветрык і ўзмахнуў сваімі маленькімі крылцамі.

Варгін падзівіўся, як лёгенька балансуе Паветрык між лісця і сам умомант адарваўся ад галіны. Але ён не балансаваў. Кашэчы кароль, як страла, працінаў лісце. І, калі апынуўся над каштанам, прыціснуў вушы да галавы, шырока распрастаў тоўстыя чорныя лапы, выгнуў трубою хвост.

— Слаба ляціш, — крыкнуў ён Паветрыку і пачаў узнімацца ўсё вышэй і вышэй.

— Чарныш! Чарныш! Кіс-кіс-кіс! — быццам далёкае рэха даляцела да яго знізу.

Гэта быў голас Ларыскі. Дзяўчынка расхінула галінкі белай гартэнзіі і адазвалася ўжо да Юрасіка, які

кійком разгортваў высокую траву каля суседняга куста: — Юрась, тут таксама няма ката? Можа, пойдзем за дом? — яна зірнула на хлопчыка і раптам так закрычала, што Юрасіку схацелася закрыць далонямі вушы: — Юрась! Юрась! Хутчэй глядзі ўверх! Над домам ляціць кот! Чорны вялікі кот!

Юрась падняў позірк і знерухомеў. Ён проста аслупянеў. «Гэта ж — Чарныш!» — ледзь не выгукнуў ён і ўсё ж устрымаўся. Юрасік ведаў, што каты не лётаюць, і не мог паверыць таму, што бачыў. «Ну так, галава, чатыры лапы, доўгі пушысты хвост. Вельмі падобна да ката. І ўсё ж! Усё ж такога не бывае, каб каты лёталі ў небе. Гэта нерэальна», — заключыў ён і адазваўся да Ларыскі:

— Каты не могуць лётаць! Хутчэй за ўсё гэта нейкая птушка. Цяпер жа клімат рэзка мяняецца. У нас амаль зусім няма зімы. Можа, яна з далёкіх джунгляў да нас выпадкова заляцела. — Ён задумаўся на імгненне і сказаў: — Я чуў, што ў нашых лясах жыве птушка крыжадзюб. Ну, а гэтую недзе, дзе яна спрадвеку жыве, могуць называць птушкакот. Нам пашанцавала яе пабачыць. Раскажу сёння Наташцы, што ў небе бачыў птушкаката.

Ларыска паглядзела ў неба і ўжо нічога там не пабачыла.

— Ты ўпэўнены, што гэта была птушка? — запыталася яна ў Юрася, і ў яе голасе чулася сумненне.

— Упэўнены, — адказаў хлопчык і разгарнуў куст белай гартэнзіі, які ўжо расхінала Ларыска: — Кіс-кіс-кіс, Чарныш!

Ён і падумаць не мог, што ў гэты самы час кашэчы кароль і Паветрык ужо апускаліся на высокі бераг глыбокай вірлівай рэчкі.

— Ну і дзе тое дрэва, на якім ты бачыў Русалку? — запытаўся кот Варгін у Паветрыка, калі яны прызямліліся. — Пакуль мне бачыцца толькі асака ды чараты ў нізінцы.

— А ты паглядзі вунь туды, — паказаў крылцам Паветрык. — Бачыш кусты? За імі — палянка. Там і невялікія дрэвы ёсць. Узнімайся! Мы мігам там апынемся.

Паветрык адарваўся ад зямлі. А кот Варгін нават і не ўзнімаўся ў паветра. Ён з такой шалёнай хуткасцю кінуўся ў бок кустоў, што Паветрык міжволі падзівіўся і нават пазайздросціў кашэчаму каралю.

## СУСТРЭЧА З РУСАЛКАЮ, альбо КОТ ВАРГІН — ВЯЛІКІ ЦЫРУЛЬНІК

Варгін адразу пабачыў Русалку, як толькі апынуўся ў густой траве за кустамі. Яна стаяла каля алешыны, што расла на палянцы, і пільна ўзіралася ў бліжэйшы да яе куст глогу. Кашэчы кароль затаіў дыханне. Ён упершыню бачыў так блізенька ад сябе Русалку, і яго зялёна-жоўтыя вочы гарэлі цікавасцю.

— Чаго ж яна так насцярожана ўзіраецца ў гэты куст? Мабыць, Паветрыка там прыкмеціла, — падумаў ён і адзначыў: — Калі б не вялікі лускаваты хвост, раздвоены ў канцы, і не доўгія зялёныя валасы, яе можна было б прыняць за прыгожанькую дзяўчыну, хоць і выглядае яна надта ўжо бяскроўнай. Яшчэ і вочы ў яе што шкляныя. Жывога бляску ў іх няма. — Варгін яшчэ нейкае імгненне паўзіраўся ў Русалку і пацёр лапаю нос, над якім закруцілася нейкая нахабная мошка: — Дык што ж? Напэўна, мне трэба падаць голас. Чаго я чакаю? Няхай знойдзе Русалачка ў траве чорненькага коціка, а там ужо і пазнаёмімся. — Ён паглядзеў па баках: — Ну і куды ж гэты Паветрык падзеўся? Штосьці я нідзе не бачу яго паблізу? Відаць, ён і сапраўды зашыўся ў той самы куст, куды ўсё яшчэ глядзіць Русал-



ка, каб перадыхнуць пасля гэтага нашага неспадзяванага пералёту. Я не супраць, хай адпачне дзіцятка нябесных вышыняў. Кволенькі вельмі. Мне ж адпачываць не трэба. Я — кашэчы кароль. — Ён выпнуў грудзі наперад. — Я заўжды поўны сілы! — і Варгін так гучна мяўкнуў, што з травы падняўся цэлы рой мошак. І тут, якраз у гэты момант здарылася тое, чаго кашэчы кароль ніяк не чакаў.

— Ай-я-яй, я-яй, — раптоўна заверашчала Русалка і заскакала, з боку на бок пакалыхваючыся на сваім хвасце, замахала рукамі, быццам адмахвалася ад мноства пчол. Потым схапілася за галаву: — Ай-ай, адчапіся, нячысцік! Што ты робіш?! А-ай!

«Ого, якой прыткаю стала», — падумаў кашэчы кароль. А Русалка то хапалася за галаву, то, як шалёная, махала рукамі. Валасы ж яе тым часам узнімаліся, разляталіся ва ўсе бакі і кудлачыліся. Русалчына галава ўжо нагадвала галаву старажытнагрэчаскай Медузы Гаргоны.

— Адчапіся! Згінь, нячысцік! — крычала Русалка: — Што ты робіш з маімі прыгожымі валасамі?!

Тут кот Варгін і здагадаўся, што адбываецца.

— Паветрык! Гэта ён узбіўся на галаву Русалкі. Глядзі, як разышоўся! — злосна выдыхнуў ён і прашыпеў: — А Паветрык і сапраўды нячысцік, а не дзіцятка нябесных вышыняў, як я раней думаў. І зусім не кволенькі ён. Дык што, пазмагаемся?! Трэба ратаваць Русалку.

Але ніякага змагання не здарылася. Кашэчы кароль выгнуў спіну і так скакануў, што ўмомант апынуўся над раскалмачанай Русалчынай галавою.





Ён на імгненне завіс над ёю, выпусціў з тоўстай лапы ўсе кіпцюры і адным рыўком выцягнуў ужо даволі знясіленага Паветрыка з яе валасоў.

— Ай! — ускрыкнула Русалка. А Паветрык сцепануўся ўсім сваім празрыстым тулавам і мармытнуў: — Э-э-э, асцярожна! Ты ледзь не парваў мяне!

— Вельмі шкада, што не парваў. Мы з табою не дамаўляліся крыўдзіць Русалку.

— А я яе і не крыўдзіў, — адказаў Паветрык. — Я проста пагуляў з яе валасамі. — Ён узмахнуў крылцамі і павольна закружыўся над палянкай, быццам выпрабоўваў свае крылы. Потым падляцеў да Варгіна і сказаў: — Вецер перамяніўся. Ён дзьме якраз у той бок, адкуль мы нядаўна прыляцелі. Ну, ты заставайся тут з Русалкаю, а я палячу назад на той каштан, дзе мы з табою сустрэліся. Можа, там ужо мяне браты чакаюць.

— Ляці, — адказаў кашэчы кароль. Ён на імгненне задумаўся і патрос лапаю наўздагон Паветрыку: — Толькі ж глядзі таго хлопчыка з дзяўчынкаю не чапай, калі раптам яны зноў усядуцца на лавачку пад каштанам! — і, калі Варгін прамаўляў гэтыя словы, у яго вачах прамільгнуў лёгкі смутак. Але гэтае пачуццё было такім мімалётным, што Русалка і не заўважыла яго. Яна з цікавасцю пазірала то ўслед Паветрыку, якога ўжо немагчыма было разгледзець, то на ката Варгіна.

— Чаго ты раскрычаўся? Ён ужо не чуе цябе, — нарэшце адазвалася яна да кашэчага караля і ўсхліпнула, абмацваючы галаву рукамі: — Лепш дапамажы мне адшукаць у траве грабеньчык, які я выпусціла з рук, як толькі гэты нячысцік накінуўся на мяне. Я не магу з'явіцца дадому з такой ускудлачанай галавою. Мне трэба расчасаць валасы, інакш старэйшыя сёстры засмяюць мяне. А стары Вадзянік гневацца будзе, — і Русалка раптоўна так разрыдалася, прыкрыўшы твар рукамі, што Варгін міжволі скрывіўся.



— Не плач. Я не люблю, калі побач са мною нехта плача, — сказаў ён. — Мы абыдземся і без твайго грабеньчыка. У мяне ж во-о, глядзі, — ён выцягнуў сваю тоўстую лапу перад сабою і выпусціў усе кіпцюры: — Гэта лепей, чым твой грабеньчык. Спадзяюся, ты мне дазволіш дапамагчы табе? Я ўмомант усё разблытаю! — і кашэчы кароль рашуча рушыў да Русалкі.

— Не падыходзь да мяне, — закрычала яна і скокнула на купіну: — Ты ж — кот Варгін! Я адразу здагадалася, як толькі ты з'явіўся з-за кустоў. Пра цябе мне аднойчы расказваў стары Вадзянік. Я цябе баюся. Ты — бязлітасны! Ты такі чорны і такі вялізны!

— Дык я магу стаць маленькім кацяняткам спецыяльна дзеля цябе. — Кашэчы кароль паблажліва пасміхнуўся і запытаўся: — Хочаш, я ім зараз жа зраблюся? Ну, а наконт бязлітаснага, гэта не пра мяне. Дарэмна крыўдзіш, — і Варгін паваліўся ў траву, закачаўся па ёй, падняў лапы ўгору, ласкава завуркатаў: — Мяўмяў, яшчэ адно імгненне і я стану такім малюпасенькім-малюпасенькім і такім пяшчотным-пяшчотным! Дык ты хочаш пабачыць мяне такім?

— Не, не хачу, — крутнула ўскудлачанай галавою Русалка. — Ты ўсё роўна будзеш заставацца Варгінам. Мне страшна, я ўся калачуся.

Але ў голасе Русалкі не чулася боязі. Гэта імгненна адзначыў кашэчы кароль і ўхмыльнуўся: «Хітрая!» А ўслых ён сказаў:

— А калі я стану Вялікім цырульнікам, ты таксама будзеш мяне баяцца?

— Стань, калі зможаш, — трошкі павагаўшыся, пагадзілася Русалка. — Я пагляджу на цябе. Мне жудасна цікава. Кот Варгін і раптам — Вялікі цырульнік! Хм-м?

Кашэчы кароль тут жа падняўся на заднія лапы. І зусім як Дамавуха ў кватэры, дзе яшчэ так нядаўна



знаходзіўся ён, Русалка ціхенька войкнула. Перад ёю стаяў кашэчы кароль у жоўтых штанах і цёмна-зялёным фраку, з-пад якога выглядвалі каўнер жоўтай шаўковай кашулі і кашнэ з чорнага аксаміту. У адной лапе Варгін трымаў расчоску, у другой — нажніцы.

— Дык што, — сказаў ён вельмі галантна і шчоўкнуў нажніцамі, — мне можна пачынаць, мая шаноўная Русалачка? Я мігам разблытаю ўсе твае кудлы.

— Пачынай, — не адразу пагадзілася Русалка і запыталася: — А чаму шаноўная?

— Разумееш, я зусім нядаўна кватараваў у горадзе ў адной кватэры. Там пазнаёміўся з Дамавухаю. Ну ты ж ведаеш, з жонкаю Дамавіка. Яны там цудоўненька прыжыліся. Ва ўсялякім выпадку я так думаю, што яны разам. Дык, чуеш, Дамавуха запатрабавала, каб я пры размове пра гаспадароў, дзе мы жылі, казаў толькі гэтак: шаноўная Валянціна Пятроўна, шаноўны Леанід Віктаравіч. Іншымі словамі, такім чынам выказваў асаблівую павагу да іх.

— Ха-ха-ха-а, — залілася смехам Русалка. — Ты мяне яшчэ зусім не ведаеш, а ўжо паважаеш, праўда?

— Я паважаю гаспадароў, у якіх кватараваў, — адказаў Варгін.

Русалка падцяла свой хвост і, спахмурнеўшы, села на купіну. І, як толькі кашэчы кароль наблізіўся да яе, папрасіла: — Ты ж глядзі, абыходзься без нажніц. А лепш, увогуле, пазбаўся ад іх. Русалкі ніколі свае валасы не падстрыгаюць. У іх — наша краса і сіла. Без іх, як і без хваста, мы — не русалкі. Табе ж падабаюцца мае валасы?

Кот Варгін толькі згодна кіўнуў галавою ў адказ. Ён шпурнуў нажніцы ў траву, і расчоска хутка-хутка замільгала ў яго лапах. Русалка зрэдку ціхенька войкала, а яе валасы ўсё выпроставаліся і выпроставаліся. Кашэ-



чы кароль разблытваў іх моўчкі. І трэба сказаць, вельмі старанна. Але, нарэшце, адазваўся да Русалкі.

— Я хутка закончу сваю працу, — сказаў ён. — І хачу, каб ты мне падзякавала за яе.

— Хочаш атрымаць грошы? — хутка запыталася Русалка. — У мяне ёсць шмат залатых манетак. Я імі ўпрыгожваю сцены. Толькі ж мне трэба спусціцца на дно ракі ў палац старога Вадзяніка.

— Не, — пакруціў галавою Варгін. — Грошы мне не патрэбны. Я абыходжуся без іх. Ты вось што... Адвядзеш мяне на палетак, дзе расце збажына, да норак мышэй-палёвак.

— Будзеш паляваць на іх?

— Навошта паляваць? — прыўзняў бровы кашэчы кароль. — Я на мышэй не палюю. Проста хачу пра тое-сёе запытацца ў іх.

— Пра што? — ажно падскочыла Русалка. — Хутчэй кажы, пра што?! Стары Вадзянік вельмі цікаўны. Мы, русалкі, таксама цікаўныя. — І ў той жа момант Русалка прыўстала з ку-



піны. Прыклала палец да сваіх бяскроўных губ і зашаптала: — Цс-с, пакуль нічога не расказвай. Маўчы. На беразе рэчкі з'явіўся рыбак.

— Ну дык і што?! — таксама шэптам прамовіў Варгін. — Няхай рыбак закідвае сваю вуду ў раку, а ты павядзеш мяне на палетак.

— Не-не, — адазвалася Русалка. — Рыбак можа пабачыць нас і спалохаецца. А стары Вадзянік забараняе палохаць гэтага рыбака. Ён чамусьці яго паважае. Хм-м, як і ты тых гаспадароў, у якіх кватараваў.

— Ну ўсё, — уздыхнуў кот Варгін, і ў яго голасе пачулася раздражненне: — Я стаў Вялікім цырульнікам. Я разблытаў усе твае кудлы. Зараз жа вядзі мяне туды, дзе расце збажына. Я нічога больш не хачу чуць ні пра рыбака, ні пра Вадзяніка. Лепш бы расказала мне штонебудзь пра мышэй-палёвак.

— Пачакай, — Русалка правяла рукамі па валасах і загадкава пасміхнулася. — Ну так, валасы ты разблытаў. Вялікі дзякуй за гэта. Але ж ты не расчасаў іх! Яны ўсё роўна тырчаць ва ўсе бакі. Дык як след расчашы іх, калі ўжо назваўся Вялікім цырульнікам. А потым, можа, я і завяду цябе да мышэй-палёвак, — і Русалка хітра-хітра заўсміхалася пры гэтых сваіх словах.

## ЦІКАЎНЫ ВАДЗЯНІК РАСПЫТВАЕ РЫБАКА ПРА КАВАЛЁЎ МОСТ

Рыбак сядзеў на валуне, што немаведама з якіх часоў ляжаў на беразе глыбакаводнай вірлівай рэчкі, да якой перад яго прыходам прыляцелі кот Варгін і Паветрык.





Ён з задавальненнем удыхаў вільготны пах цёплага адвячорку і ўжо наважваўся закінуць у раку вуду, як раптам вада ў рэчцы ўскалыхнулася і ўспенілася.

— Э-э-э, — з вады пачуўся глухі старэчы голас. — Пачакай, пакуль не закідвай сваю вуду. З рыбаю я табе дапамагу, як, дарэчы, кхекхе, заўжды дапамагаў. Зараз гаворка ў мяне да цябе ёсць.

— Цьфу ты! Сіла нячыстая, згінь! Прападзі! — перапуджана ўскрыкнуў рыбак і падняўся з валуна. Адступіўся назад, далей ад вады. Яго ўсяго абдалі халодныя пыркі.

— Ды не палохайся ты, чалавеча! — голас гучаў ужо каля самага берага. — Для кагосьці я, напэўна, Вадзянік, валадар рачных глыбіняў. А калі прасцей — дык страшыдла хвастатае. Тая самая сіла нячыстая, якую ты тут згадаў. Ну а для цябе, э-э-э...

— Ага, дружбак знайшоўся, — цяжка ўздыхнуў рыбак. — Толькі даверся твайму сяброўству, стань каля самай вады, і ты ўмомант ухопіш за нагу ды ўцягнеш у сваё царства падводнае.

— Э-э, не скажы! — пачулася ў адказ. — Дружбак — не дружбак, — з вады на імгненне вынырнуў неймавер-

на брыдкі тоўсценькі дзядок з зялёным тварам і доўгаю зялёнаю барадою, увесь аблеплены водарасцямі. — І ўсё ж... Не бойся! Сядай на ранейшае месца. Пагамонім. Я цябе чапаць не буду.

— А я і не баюся, — адказаў рыбак. — У мяне во-о торбачка на раменьчыку з попелам ёсць. Попел жа — абярэг ад вас, нячысцікаў.

— Кхе-кхе, — загучала з вады. — Справа не ў абярэгу. Каб я схацеў уцягнуць цябе на дно ракі, дык і попел твой не дапамог бы. З ім бы і ўцягнуў! Тут іншая справа. Хіба ты забыўся, як пазамінулым летам ты мяне назад у ваду завалок, калі хваля мяне на бераг вынесла. Бура тады вялікая была. Ну што, успомніў? І я таксама помню! За тое я табе вельмі ўдзячны. Дык не стой жа ты! У нагах праўды няма. Сядай на камень.

І рыбак сеў. На ўсялякі выпадак закінуў вуду. А з вады тым часам чулася:

— Паглядзі на Кавалёў мост. Туман яшчэ не запоўз на яго, дык што ты там бачыш?

Рыбак прыўзняўся і міжволі прыцішыў голас:

— Божа, ды там жа Русалка! Раней ніколі не здаралася Русалку тут пабачыць. На парэнчах сядзіць, дзіва хвастатае, доўгія зялёныя валасы ў ваду звесіла.

— Лічы, што гэта мая дачка, — сказаў Вадзянік. — Ва ўсялякім выпадку за дачку каля сябе трымаю. Але яшчэ дзве Русалкі пры мне жывуць. Адна зусім маладзенькая. Ззаду, за крокаў дзесяць ад цябе на купіне сядзіць. Спачатку на дрэве гушкалася, а зараз з катом нейкім прышлым забаўляецца. Коцік, напэўна, і не ведае, у чые рукі ён патрапіў, хі-хі-хі-і.

Рыбак уздрыгнуў і азірнуўся. Але нічога акрамя кустоў за сабою не пабачыў. А Вадзянік працягваў:

— Дык ты чуеш мяне, рыбак? Пра трэцюю, старэйшую, Русалку ў цябе запытацца хачу. Я ж вельмі цікаўны! Можа, ты што-небудзь ведаеш пра яе, можа,

паданне якое чуў? Шмат гадоў яна жыве ў маіх водах са сваім Вадзянёнкам і нічагусенькі пра сябе не расказвае, як я ні падступаўся да яе. Але бачу, што смутак вялікі яна ў сабе носіць, таямніцу глыбокую, як мая рака, — і Вадзянік зноў вынырнуў з вады. Ягоны зялёны твар зморшчыўся ва ўсмешцы, а голас быў строгі, патрабавальны: — Ты ўспомні, добра падумай.



Рыбак міжволі заплюшчыў вочы. Дрыжыкі пабеглі ў яго па спіне, і ён доўга не затрымаўся з адказам:

— Я здагадваюся, пра што ты пачуць хочаш, даруй, страхоцце рачное. — Рыбак закашляўся і працягнуў: — Хм-м, розныя людзі, пэўна, пра гэтую самую Русалку расказваюць. Дзяўчына некалі ў нашай вёсцы жыла. Паланечкай яе звалі. Каваля мясцовага кахала, і ён яе моцна кахаў. Да шлюбу яны рыхтаваліся.

— Напэўна, і мост гэты той каваль зладзіў? — адазваўся цікаўны Вадзянік.

— Не, мост сяляне пабудавалі, — сказаў рыбак. — А каваль толькі парэн-

чы выштукаваў. Але мост пачалі называць Кавалёвым. Самога ж каваля ў суседнюю вёску паклікалі, каб і там ён такімі ж парэнчамі мост упрыгожыў. А потым і ў яшчэ адну вёску запрасілі. Затым — у наступную, дзе таксама прыгожы мост людзі схацелі мець. Адным словам, затрымаўся каваль. Доўга дамоў не вяртаўся. Ну, а Паланечка чакала, чакала яго і ў нейкі момант не вытрымала, знудзілася вельмі. А тут яшчэ і чуткі розныя па вёсцы пайшлі, быццам той каваль недзе там закахаўся ў іншую дзяўчыну і дадому ўжо не вернецца. Вось Паланечка аднойчы і ўзбегла на мост, ды і кінулася ў гэтую рэчку, у самае вірлівае яе месца.

— Ага-а, дык я, напэўна, таго самага каваля калісьці бачыў. Я ж тут усім цікаўлюся. Ад мяне ніхто і нішто не схаваецца, — адгукнуўся Вадзянік. — На мост гэты каваль прыходзіў. Да яго і Русалачка наша са сваім Вадзянёнкам з ракі выйшла. Нешта сказала яму, і ён пярсцёнак з кішэні дастаў, у ваду яго ўкінуў. Той пярсцёнак пасля Русалка на дне знайшла, але на пальцы яго ніколі не насіла, на шыю павесіла. А вось што яна сказала кавалю, для мяне гэта загадка. Таму што больш ніколі-ніколі на мост каваль не прыходзіў.

— Ат, — махнуў рукою рыбак. — Ніякай загадкі няма. З дзяўчынаю на мосце сустрэцца можна. А з Русалкаю не кожны хлопец сустракацца асмеліцца. Міргнуць не паспееш — у ваду ўцягне. Бр-р-р, барані Божа ад такіх сустрэчаў.

У гэты момант уздыбілася рака. Пыркі вады каля моста ўзляцелі ўверх фантанам.

— О-о, — тут жа адазваўся Вадзянік. — Мая дачушка дадому вярнулася. Саскочыла ў раку з моста. Не спадабаліся ёй твае словы, рыбак. А вось і другая вяртаецца...

У гэты момант рыбака абдало холадам. Зусім блізенька ад яго, моцна хістаючыся, праляцела прыга-

жуня з доўгімі зялёнымі валасамі. Здавалася, што яна ледзь-ледзь датыкаецца сваім раздвоеным хвастом да зямлі. А яе валасы так разляталіся, што адна пасма зачапіла рыбака. Русалка кінулася ў ваду і адразу схавалася ў рачных глыбінях.

Рыбак ускочыў з валуна, выцягнуў з ракі вуду, схапіў мяшок для рыбы. Ён хацеў пабегчы ў блізкія чараты, але яго спыніў гучны старэчы голас:

— Ну куды ж ты, рыбак? Закідвай зноў сваю вуду. Я ж абяцаў табе дапамагчы з рыбаю, — Вадзянік яшчэ раз вынырнуў з вады і застыў над паверхняй.

З кустоў імкліва выскачыў раз'юшаны кот Варгін. Ён ляцеў проста на рыбака, але ў нейкі момант рэзка звярнуў і з усяго разбегу боўтнуўся ў рэчку. Якраз у тым месцы, куды зусім нядаўна скочыла Русалка. Высока-высока ўзняліся пырскі вады. Рыбак знерухомеў, не паспеўшы закінуць вуду, а Вадзянік сказаў:

— Ціка-а-ва! Вельмі нават цікава, які нечаканы госць да мяне завітаў. Вось каго не чакаў, дык не чакаў. А я ж думаў, што мая дачушка з нейкім звычайным прыблудным коцікам забаўляецца. Ну чаго ж ты марудзіш, рыбак? Хутчэй закідвай вуду, калі хочаш дадому вярнуцца з рыбаю!

І рыбак закінуў вуду. Ён ужо выцягваў з вады вялізнага-вялізнага шчупака, калі раптам з ракі, з самага яе дна пачуўся гучны енк. Гэта верашчалі перапуджаныя Русалкі.

— Ого-о, — ускрыкнуў Вадзянік. — Мне трэба спяшацца, рыбак. Хапай шчупака і хутчэй ідзі адсюль, бо невядома чым можа скончыцца мая сустрэча з гэтым нечаканым госцем.

І тут жа шумная пеністая хваля набегла на бераг. Вадзянік вяртаўся ў свае ўладанні, у сваё падводнае царства. А рыбак, запіхваючы ў мяшок шчупака, падумаў: «Дзіва дзіўнае, я з сабою торбачку з попелам на рыбалку

бяру супраць нечысці рознай, а, відаць, трэба браць чорнага ката. Вунь як занепакоіўся і заспяшаўся на дно ракі Вадзянік. Аказваецца, катоў стары нячысцік баіцца!»

І каб жа ведаў рыбак, як ён памыляецца. Вадзянік не баяўся катоў. Проста ён пазнаў кашэчага караля і яму карцела як мага хутчэй сустрэцца з катом Варгінам, каб дазнацца, што прымусіла таго завітаць у падводнае царства ды яшчэ ўчыніць перапуд сярод Русалак.

## КОТ ВАРГІН У ПАДВОДНЫМ ЦАРСТВЕ

Калі стары Вадзянік апусціўся на дно ракі, дык у адным з пакояў свайго прасторнага падводнага палаца ён адразу ж пабачыў ката Варгіна. Кашэчы кароль кругамі насіўся ўздоўж сцен, з興пленых з жоўтага рачнога пяску і дробнага камення. Гэтыя сцены былі завешаны самымі рознымі водарасцямі: кучаравымі і проста доўгімі, як вяроўка. Водарасці прыгожымі гірляндамі звісалі са сцен. Варгін зазіраў то за адну, то за другую гірлянду, і выгляд у яго быў раз'юшаны: вочы гараць, вусы трымцяць. За гірляндамі хаваліся дзве Русалкі. Яны хутка перамяшчаліся з аднаго месца на другое, і кашэчаму каралю ніяк не ўдавалася ўхапіць за слізкі хвост адну з іх. Але, нарэшце, ён усё-такі ўхапіў яе. І гэта была тая самая маладзенькая Русалка, валасы якой з паўгадзіны таму назад Варгін так старанна разблытаў і расчасаў. Ён моцна, як толькі мог, з пачуццём вялікага задавальнення прыціснуў яе мокры, вяртлявы хвост кіпцюрамі.

— Ну што, цуда рачное, усё-ткі схітравала! — упікнуў ён Русалку. Але ў яго голасе не чулася пагрозы. Хутчэй, была паблажлівасць. — Я разблытаў твае валасы, расчасаў іх, а ты як падзякавала мне? Не завяла мяне да мышэй-палёвак! Ды я, дарэчы, гэтага і чакаў. Усё ж нораў у цябе пачварны!





— Ай, ай-я-яй, — закрычала Русалка. Яна з перакошаным тварам выглянула з-за водарасцяў і злосна прашыпела: — Зараз жа адпусці мой хвост, нячысцік! Вось вернецца наш бацька, і ён не паглядзіць, што ты — кашэчы кароль!

— Ага-а, не паглядзіць, — з-за водарасцяў падтакнула другая Русалка.

— Я ўжо вярнуўся, — прабурчэў Вадзянік. Ён хутка пратэпаў па пакоі, трасучы мокрым доўгім хвастом, і з цяжкасцю сеў на груваcткі трон, зроблены з камянёў і аздоблены залатымі манетамі. — Вух, нахапаўся паветра! Цяжка мне. Нарэшце я ў сваёй троннай зале.

Кашэчы кароль умомант адпусціў хвост Русалкі, якая тут жа выслізнула з-за водарасцяў, паказала пальцам на Варгіна і хутка-хутка залапатала:



— Ён хацеў сустрэцца з палёўкамі, каб пра нешта запытацца ў іх. Пра што, не сказаў! А я спяшалася дадому. Ы-ы-ы-ы, ён пашкодзіў мой хвост, — разрыдалася Русалка.

— Цыц! Сціхні! — прыкрыкнуў на яе стары Вадзянік і з дакорам паглядзеў на кашэчага караля, прыўзняў бровы, зморшчыў і без таго зморшчаны лоб: — Ну, я так разумею, што пры сённяшняй нашай сустрэчы абдымацца мы з табою, Варгін, не будзем?

Кот кіўнуў галавою і невыразна прамармытаў:

— Не будзем!

Ён уважліва пазіраў на гірлянды водарасцяў, на шэры някідкі трон, дзе сядзеў Вадзянік і думаў, што надта ж бедная гэтая тронная зала. Падводныя царскія пакоі ён уяўляў інакшымі. «Нават тэлевізара сабе не прыдбаў, — паўшчуваў ён у думках старога Вадзяніка. — А мог бы дамовіцца з рыбаком у абмен на рыбу!»

З-за водарасцяў з’явілася яшчэ адна Русалка. Яна адразу ж наблізілася да трона і зашаптала на вуха Вадзяніку:





— Можа, сюды прыцягнуць стол? Я сёння неслухаў акунёў налавіла.

Вадзянік адмоўна хітнуў галавою, і Русалка пайшла да сястры, ледзь не сутыкнуўшыся з Варгінам, які раптоўна кінуўся да Вадзяніка з працяжным:

— Мя-я-я-яў!

На сценах закалыхаліся водарасці. Вадзянік прыўстаў, рэзка выцягнуў уперад крывыя рукі, быццам хацеў ухапіць ката, а кашэчы кароль паваліўся перад тронам і пачаў па-штукарску выгінацца, качацца і ласкава вуркатаць.

— Эхе-е-е-хе, — з палёгкаю ўздыхнуў Вадзянік і апусціўся на ранейшае месца. — А ты, Варгін, аніколечкі не змяніўся за гэты доўгі-доўгі час. Колькі ж гэта мы з табою не бачыліся? Сто, дзвесце гадоў? А ты ўсё гэтак жа качаешся ды ласкава вуркочаш. Але ж мяне не правядзеш! Ведаю, што хаваецца за гэтым тваім качаннем.

Кашэчы кароль імгненна ўскочыў з пясчанай падлогі. Ён з-пад ілба зіркнуў на Вадзяніка і сказаў:

— Крыўдзіш мяне, шаноўны! Я па даўняй звычцы сваёй качаюся.

— Бацька, ён цябе паважае! Назваў шаноўным, — віскнула маладзенькая Русалка і дадала: — Як і гаспадароў, у якіх кватараваў нядаўна.



— Цыц! — зноў-
ку прыкрыкнуў на яе Вадзянік і звярнуўся да Варгіна:

— Значыцца, кватараваў недзе?

— Так, — хутка адказаў кот. — У вялікім горадзе. У шаноўных Валянціны Пятроўны і Леаніда Віктаравіча.

Варгін хацеў яшчэ нешта сказаць, але Вадзянік перапыніў яго:

— Ну, пра гэта ты мне пазней раскажаш, а я сваю думку давяду да канца. Дык хочаш сказаць мне, што ты змяніўся? Дарэмна так думаеш, Варгін. Эх, дарэмна! Гэта свет наўкол нас памяняўся, даражэнькі. Ты млын на гэтай рэчцы памятаеш?

Кашэчы кароль скасавурыў убок свае зялёна-жоўтыя вочы і моўчкі кіўнуў галавою. А Вадзянік працягваў:

— Вядома ж, і млынара даўгалыгага помніш. Мы з ім, з тым млынаром, заўжды ладзілі. Ён мне ўсё курачак падкідваў у ваду. Дык вось здаралася, адвячоркам падплываў я да кладкі, дзе жанчыны звычайна пранікам бялізну адбівалі. А тут ужо ты на кладцы сядзіш, мяне чакаеш. Памятаеш? Ну і пачынаў ты мне расказваць пра свае прыгоды ў розных сядзібах, дзе прыжываўся на нейкі час. Дык, чуеш, у млы-



нара даўгалыгага ад тых тваіх аповедаў валасы на галаве варушыліся. А цяпер што? — ён паглядзеў на Варгіна, які, насупіўшыся, нецярпліва памахваў хвастом, маўляў, хутчэй заканчвай ты гэтыя свае ўспаміны, і ўздыхнуў. Вадзянік зразумеў, што кату хочацца пагаварыць пра нешта зусім іншае. І ўсё ж ён давёў сваю думку да канца: — Вось я сёння з рыбаком размаўляў, — сказаў ён. — А тут ты на яго з кустоў як папёр, ды потым усёткі ўбок звярнуў. Ну і што? Рыбак у табе не прызнаў ката Варгіна. Ён, даруй, ужо нічога не ведае пра кашэчага караля. Кхе-кхе-кхе, час змяніўся! Далёка ўжо тыя сядзібы, той млын з млынаром даўгалыгім. — Вадзянік на нейкі момант перапыніўся, быццам узгадваў нешта, а потым запытаўся ў Варгіна:

— Ну а як жа ты жыў у вялікім горадзе? Якім было тваё кватараванне? Вось цяпер раскажы мне. Я, ведаеш, усё такі ж цікаўны, як і раней! Хаця, чакай, не расказвай!

Ён рукою падклікаў да сябе Русалак і, калі яны наблізіліся да яго, сказаў:

— Падніміцеся наверх, паглядзіце, ці не сядзіць там на беразе рыбак са сваёю вудаю. Можа, яму мала аказалася аднаго шчупака? Дык, калі раптам сядзіць, падганіце да яго вуды чародку ёршыкаў ці акунёў.

Русалкі, якія ўвесь гэты час уважліва прыслухоўваліся да размовы Вадзяніка з кашэчым каралём, пацiснулі плячамі, гучна фыркнулі, а маладзенькая яшчэ і пажалілася:

— У мяне хвост баліць, трываць не магу. Як я з параненым хвастом паднімуся?

— Паднімешся, — як адрэзаў стары Вадзянік. — Зараз жа і паднімайцеся! А мы тут з Варгінам яшчэ трошкі пагамонім.

Русалкі знарок з усёй сілы ўзмахнулі хвастамі і паплылі. Варгін злосна паглядзеў ім услед і манерна абтрос пеністыя пырскі са сваёй густой чорнай поўсці. Вадзянік захіхікаў:

— Хі-хі-хі, мае дачушкі з характарам. Слухай, — звярнуўся ён да ката: — А ты добра ваду пераносіш! Толькі цяпер заўважыў, што ты ж сухі зусім. Хм-м, столькі часу ў вадзе, а твая поўсць сухая!

Кашэчы кароль нічога не прамовіў у адказ. Вадзянік таксама памаўчаў, а потым запытаўся: — Я, ведаеш, пры Русалачках не хацеў цябе распытваць, дык зараз скажы, за што ты так угневаўся на маю малодшанькую? Ну, а пра тваё кватараванне мы неяк іншым разам пагамонім.

— Яна мяне падманула, — буркнуў кашэчы кароль. — Я разблытаў яе валасы, якія ўскудлаціў Паветрык. Мы з ім разам сюды з горада прыляцелі. Потым яна загадала, каб я ёй яшчэ і як след расчасаў іх. Ну, а ў знак удзячнасці папрасіў завесці мяне на палетак да мышэй-палёвак.

— Вось яно што-о, — у голасе старога Вадзяніка пачулася здзіўленне, і ён сказаў: — Дзіўнай падзякі табе схацелася, кхе-кхе-е, кашэчы кароль.

— Мне паразмаўляць з палёўкамі трэба. Магчыма, хтосьці з іх падкажа,



як патрапіць у тое падзямелле, дзе зараз можа знаходзіцца мышка Паднорка. Прынцэса. Дачка цара Паднора. Я з ёю пазнаёміўся ў гаспадароў, дзе кватараваў.

— Толькі і ўсяго? — Вадзянік ажно саскочыў з трона, пляснуў у далоні:

— Эх! Дык я табе дапамагу, Варгін! З радасцю! Я падкажу, дзе тое падзямелле. Чаму б і не? — І тут ён нечакана цяжка ўздыхнуў раз, другі, быццам раптоўна штосьці закалола ў яго грудзях і прашамкаў: — Ты Змеевы камень памятаеш?

— Той самы, у якім Косцік-кравец жыў? Кажы, той?! — запытаўся кашэчы кароль, і яго зялёна-жоўтыя вочы загарэліся нецярплівасцю.

— Ну, вядома, той! Ты ж калісьці ўсё бегаў да таго каменя. Яго тады людзі яшчэ і Косцікавым каменем называлі, бо там сапраўды жыў Косцік-кравец. Дык вось, якраз пад тым каменем уваход у падзямелле, дзе знаходзяцца ўладанні Паднора. Толькі ж самога Паднора даўно няма. А вось Паднорка днямі з'явілася. Цяпер яна ў залатой клетцы сядзіць. Нявольніцай паганага Пацука стала, які жыве ў Паднаравых уладаннях.





— А ты пра гэта адкуль ведаеш? — падскочыў да Вадзяніка кашэчы кароль.

— Хм-м, я ж цікаўны! Сёння на досвітку ад жабоцькі адной пачуў.

Варгін натапырыў вушы і сказаў:

— Русалкі твае вяртаюцца, дык, можа, якая з іх правядзе мяне да Змеева каменя. Баюся, што сам блукаць пачну. Столькі часу прайшло. Помню вёску невялікую, за ёю ўзгорак высокі. На ім і ляжаў той камень.

— Ат, — махнуў рукою Вадзянік. — Даўно няма той вёскі. Яшчэ на пачатку мінулага стагоддзя Жыжаль дашчэнту яе агнём скасіў. Там цяпер людзі дарогу шырокую праклалі. Асфальтаваную. Недзе недалёка ад той дарогі камень і ляжыць. Не знойдзеш сам. Не-е, не знойдзеш! — пакруціў галавою Вадзянік.

І тут здарылася неверагоднае. У Вадзяніка раптоўна доўгі тонкі хвост заторгаўся, а слязістыя з чырвонымі прожылкамі вочы закаціліся пад лоб. Ён пачаў частачаста дыхаць і ўпаў, паваліўся на жоўтую пясчаную падлогу. Кашэчы кароль атарапеў і на ўсякі выпадак працяжна мяўкнуў:

— Мя-я-я-яў!

Тут і з'явіліся запыханыя Русалкі. Адна схілілася над Вадзянікам, а другая, маладзенькая, накіравалася да Варгіна і пачала падскокваць вакол яго, спрабуючы сцебануць кашэчага караля сваім слізкім лускаватым хвастом.

— Што ты нарабіў?! — крычала яна. — Што нарабіў, нягодны нячысцік! Ты напусціў на яго нейкія свае чары ці сурочыў! А вось табе! А вось табе на-а! — раз за разам узмахвала яна мокрым слізкім хвастом, і Варгін не паспяваў абтрасаць з поўсці халодныя пырскі.

Тут з другога пакоя і выйшла яшчэ адна Русалка. Кашэчага караля здзівіла, што на ёй была доўгая спадніца і кофта з брыжыкамі. «Ну зусім як у Дамавухі



гэтыя брыжыкі, — падумаў кот. — Толькі сама кофта больш фасоністая, — і раптам ледзь чутна ёкнула сэрца Варгіна, лёгенька затрапятала ў грудзях. — Хм-м-м, цікава, як яна там, Дамавуха? А Дамавік? Не хачу, а вось жа думаецца, ці забрала яго гаспадыня са старой кватэры? Пэўна, усё ж забрала! Малая Наташка не дазволіла б зноў пакінуць яго». Але гэтыя мімалётныя думкі як узніклі, так вельмі хутка і адляцелі. Яго ўжо непакоіла маладзенькая Русалка, якая ўсё яшчэ спрабавала сцебануць яго сваім лускаватым хвастом.

— Сціхні, сястра! Перастань скакаць як шалёная! — прыкрыкнула на яе Русалка, якая толькі што з'явілася ў троннай зале. Затым яна хутка падышла да Варгіна.

— У бацькі — дыхавіца, — сказала Русалка, ціха ўздыхнуўшы. — З ім такое здараецца, калі нахапаецца залішне паветра на паверхні. Ён хутка ачуняе.

— Ніякая гэта не дыхавіца! Гэта ўсё Варгінавы чарадзейныя штучкі! Ён майстар на такое! — не супакойвалася маладзенькая Русалка.

А старэйшая зноў звярнулася да кашэчага караля:

— Я тут разбяруся з сёстрамі. Ды і Вадзяніка трэба перанесці ў другі пакой. А ты, Варгін, давай выбірайся на паверхню. Я чула вашу з бацькам размову, — і яна

бы праціяла яго доўгім нежывым позіркам. Можа, вывучала, ці варта яму гаварыць тое, што хацела. І ўсё ж сказала: — Як выберашся на бераг, пачакай мяне. Я правяду цябе да Змеева каменя.

І ў адказ кашэчы кароль толькі моўчкі кіўнуў галавою. Маўляў, я ўсё зразумеў, дзякуй табе. Ён шырока раскінуў лапы, падняў хвост і вельмі хутка пакінуў падводнае Вадзянікава царства.

## РУСАЛКА РАСКАЗВАЕ КАТУ ВАРГІНУ ПРА РУЖОВУЮ ФЕЮ І ЖАБЕР-ТРАВУ

Варгін хутка выбраўся на бераг ракі і быў вельмі ўражаны, што ўжо настала ноч. Бераг быў цёмны-цёмны. Толькі яго зялёна-жоўтыя вочы ў гэтай цемені свяціліся яркімі агеньчыкамі, ад чаго цемра наўкол здавалася яшчэ больш густой. Але яна не для яго. Не для ката Варгіна! Ён вельмі добра бачыў кусты, за якімі была палянка, дзе ён разблытаў і расчасаў валасы маладзенькай Русалцы. Бачыў ён і нізінку з чаратамі. А вось уявіць, дзе былі калісьці кладка і млын з даўгалыгім млынаром, пра якія згадваў Вадзянік, як ні напружваўся, ніяк не мог. Усё наўкол непазнавальна змянілася. Адно



туман гэткаю парою нязменна рассцілаўся па траве. Варгін пераступіў з лапы на лапу і сцепануўся: «Мя-я-яў, халаднавата і хоць бы адна зорка ў небе! — Кашэчы кароль азірнуўся, паглядзеў то ў адзін, то ў другі бок і ўздыхнуў, падумаў: — Не, на ўсё забыўся я. Як ні пнуся, не ведаю, у які бок трэба ісці. Але ж Русалка не павінна збіцца з дарогі да Змеева каменя. Сама прапанавала правесці мяне да яго».

Тут ён раптам пляснуў сябе па галаве лапаю: «Русалка! От жа як затлуміў галаву стары Вадзянік сваёю дыхавіцай! — і ён уявіў старэйшую Вадзянікаву дачку. — Ну так! На ёй была спадніца, была кофта з брыжыкамі, але не было хваста! Вось табе і дзіва рачное! Бясхвостае! Значыцца, гэта — тапельніца, якая стала Русалкаю. Хм-м-м! — ён на імгненне задумаўся і ўзмахнуў лапаю: — Ды якая мне розніца — тапельніца яна ці не тапельніца. З хвастом яна ці без хваста. Абы завяла мяне да Змеева каменя».

І ўсё ж, калі Русалка выплыла да яго на бераг, ён запытаўся ў яе:

— А ты як апынулася тут? Ну, у рэчцы, — удакладніў ён. — Даўно ў Вадзяніка ў яго падводным царстве жывеш?

— Бач ты, цікаўны які! Я ж у цябе не пытаюся, навошта ты шукаеш мышку Паднорку? Вось і ты ў мяне ні пра што не распытвай. Лепш бліжэй да мяне падыдзі і падымі галаву.

Але пры гэтых яе словах Варгін наадварот трошкі адступіўся назад. А Русалка з кішэнькі, што была прышыта да яе кофты, выняла шаўковую тасёмку, да якой быў прычэплены невялічкі пучок нейкіх дробных зялёных сцяблінак.

— Ну, давай жа, падыходзь бліжэй і як след выцягні шыю, — строга загадала Русалка. — Прывешу да яе гэты пучочак.

— Э-э, што ты надумала? Давай без глупства, — адазваўся кашэчы кароль і недаверліва зіркнуў зялёна-жоўтымі вачамі. — Нам ісці трэба.

— Тады і пойдзем, як прывешу. Без гэтых сцяблінак табе нельга спускацца ў падзямелле, дзе знаходзіцца Паднорава царства. Там жа яшчэ і ўладанні Жыжаля ёсць. — Яна расцягнула ва ўсмешцы свае бяскроўныя губы: — Думаю, што з Жыжалем табе даводзілася ўжо і раней сустракацца?

— Не, — крутнуў галавою Варгін. — Мы не сустракаліся. А вось чуць пра яго шмат чаго чуў, — і ён прыжмурыў свае зіркастыя вочы. — Ведаеш, гэта ж я для людзей — нячысцік паганы. А Жыжаль, о-о-о-го-го, будзь здароў! Ён — бог агню.

— Во-во, бог агню, — адазвалася Русалка. — Дык як ты праз агонь без гэтых сцяблінак пройдзеш? Гэта — жабер-трава! Яе вельмі баіцца Жыжаль. Як толькі ўгледзіць гэты пучочак у цябе на шыі, дык і панікне. Умомант перастане пыхкаць агнём. Тут шлях у Паднорава царства для цябе і адкрыецца.

Кашэчаму каралю хацелася разрагатацца. «Вой, напалохала! Як жа ты памыляешся, дзіва ты маё бясхвостае! Як кепска ты пра мяне думаеш, — карцела яму сказаць Русалцы. — Ды я праз любую сцяну праходжу! У халадзільнік пры зачыненых







дзверцах залажу. Нават праз плазменную тэлевізійную дошку прайшоў, паказаў класны фокус-мокус малой Наташцы! Дык што, ты лічыш, што я не прайду цераз агонь?»

Русалка пабачыла, што кашэчы кароль чамусьці вагаецца, і сказала:

— Жабер-трава магутны сродак супраць Жыжаля. Праўда, ты і сам — магутны. Пры любых абставінах не дасі маху. Гэта ўсім вядома, Варгін. Людзі нават дадому вяртаюцца, не ідуць далей, калі раптам ім дарогу перабяжыць чорны кот. І ўсё ж… — яна скрывіла тонкія губы: — Ты, безумоўна, можаш прайсці праз агонь. А вось ці пройдзе праз яго мышка-прынцэса, калі будзеце вяртацца з Паднорава царства, як ты яе вызваліш, гэта вялі-і-ікае пытанне!

Кашэчы кароль з сілаю дзерануў мокрую траву лапаю і мармытнуў, выцягнуўшы шыю:

— Вешай! Толькі не зацягвай моцна тасёмку. Будзе ціснуць, дык яшчэ незнарок сарву яе разам з тваім пучочкам.

— Я лёгенька.

Русалка хутка прывязала да Варгінавай шыі тасёмку, і Варгін тут жа даткнуўся да жабер-травы. З усіх бакоў абмацаў пучочак лапаю: «Ну, вось і я ашчасліўлены, — пакпіў ён з самога сябе. — У мяне пучок з травою на шыі будзе матляцца, а ў Падноркі — дыямент на залатым ланцужку!» — зга-

даў ён мышку-прынцэсу і заўважыў, што пачаў адставаць ад Русалкі.

Яны ўжо міналі нізінку з чаратамі.

— Ночы цяпер кароткія. А ты, Варгін, не спяшаешся, быццам крокі свае лічыш, — адазвалася Русалка: — Мне зацемна да Вадзяніка вярнуцца трэба.

— Хм-м, сказанула! Я не лічу крокаў, я думаю, — адказаў кашэчы кароль. — Цяжка паверыць, што Жыжаль можа баяцца гэтай травы. Глупства нейкае! Водарасць звычайная.

— А я зараз табе раскажу і пра Жыжаля, і пра гэтую водарасць. Тое, што калісьці сама ад людзей чула. Можа, казачка, а можа гэтак і было. Хочаш паслухаць? — запыталася Русалка.

Варгін не марудзіў з адказам:

— Давай пачынай, — сказаў ён. — За размовай дарога заўжды карацейшаю здаецца.

— Ну дык вось як усё было, — пачала расказваць Русалка. — Сюды да нас фея з нейкіх далёкіх краёў пачала прылятаць. І людзі яе адразу назвалі Ружоваю феяй. Крылцы ў яе былі ружовыя, сукеначка — ружовенькая. І туфлікі такія ж самыя, бы ў маленькую ружовую кветачку фея была абутая. Не кожнаму яна траплялася на вочы. Але калі некаму выпадала пабачыць яе, дык чалавека ахоплівала такая вялікая радасць, што ён уміг забываўся на ўсе бядоты і цяжкасці. Неяк так пачынала атрымлівацца, што яго жыццё рабілася лягчэйшым. Дарэчы, і ручкі, і ножкі ў феі былі ружовыя, — азірнулася Русалка, бо кот Варгін зноў пачаў



адставаць. — Хвост паднімай вышэй, ён у цябе заблытваецца ў зарасніку, — прыкрыкнула на кашэчага караля Русалка і стала зноў расказваць пра фею. — Дык, значыцца, фея была ўся ружовенькая, а вось тварык яе зіхацеў золатам. Гэта фея пудрылася залатою пудраю. Людзі казалі, што на яе тварыку быў шрам ад глыбокай драпіны.

— Мя-я-яў, дык, відаць, Паветрык яе моцна падрапаў?! Мне давялося быць сведкам, як ён на тваю малодшую сястру напаў! — мяўкнуў кашэчы кароль.

— Хто ведае, можа, і Паветрык, — адазвалася Русалка і працягнула: — Тыя, каму ўдавалася Ружовую фею пабачыць, казалі, што заўважалі ў яе залаценькі ражок, які яна насіла на залатой нітцы на шыі. Ну, а ў тым ражку — залатая пудра! І вось аднойчы, калі Ружовая фея зноў прыляцела да нас, апынулася яна каля нашай рэчкі. Тады спёка моцная была. Дзень быў ціхі-ціхі. А вада ў рэчцы што люстэрка. І схацелася феі паглядзецца ў яго. Сагнулася яна над вадою, тут залатая пудра і высыпалася з ражка. Пачала асядаць і асела на жабер-траву. І ўсю-усю яе запарушыла. Як жа тут заззяла жабер-трава! Якім дзівосным бляскам засвяцілася!

А якраз у той спякотны дзень Жыжаль вырашыў са свайго падзямелля на паверхню выбрацца. Вось і выйшаў ён, і пачаў агнём пыхкаць і на траву, і на дрэвы. Ды яму і пыхкаць асабліва не трэба было. У яго ж на галаве карона з агню. Іскры ад яе ва ўсе бакі разлятаюцца. А замест пальцаў і на нагах, і на руках у яго — язычкі полымя. Ступіць Жыжаль на зямлю — і тут жа ўсё загараецца наўкол. І ўжо цяжка той агонь патушыць.

Ну, дык вось, ідзе Жыжаль, ідзе, а вакол яго полымя зыркае бушуе. І тут раптам птушачка маленькая крылцамі затрапятала над Жыжалем. І заціўкала яна,

маўляў, калі Жыжаль — бог агню, дык ён думае, што яму ўсё дазволена. А яшчэ лічыць, што ён самы яркі і зіхатлівы. Толькі ж дарэмна ён гэтак думае! Аказваецца, тая птушачка ў той спякотны дзень над нашаю рэчкаю пралятала і пабачыла ў ёй жабер-траву. І так ужо жабер-трава ззяла, што Жыжалю далёка было да таго бляску. Пачуў пра тое Жыжаль і прагрымеў у адказ, пырскаючы іскрамі:

— Ну дык паказвай мне дарогу да гэтай ракі!

— Ну і павярнуў ён назад. Пайшоў да нашай рэчкі, — не сціхала Русалка, — туды, куды паляцела птушачка. Вельмі ж яму хацелася паглядзець на жабер-траву, каб на свае вочы пераканацца, што птушачка праўду яму сказала. А калі, нарэшце, дайшоў ён да ракі і зірнуў у ваду, дык і пабачыў, што не падманула яго птушачка.

— Я — бог агню, — закрычаў ён на ўсё наваколле. — Ніщто не смее быць ярчэйшым! А тут, бач, нейкая жабер-трава блішчыць у вадзе, бы абсыпаная сонечнымі промнямі. Раззлаваўся Жыжаль і сунуў руку ў ваду, каб вырваць яе. І ўмомант аднялася ў яго рука па локаць. Яшчэ больш разгневаўся бог агню. Сунуў ён у ваду сваю другую руку — і яна таксама аднялася, толькі ўжо ажно па плячо.

— Ты чуеш? — нечакана тузануў кот Варгін Русалку за рукаў кофты і спыніўся. Ён натапырыў вушы, павадзіў імі то ў адзін, то ў другі бок: — Машына дзесьці паблізу прасігналіла. І вунь там, глядзі, фары бліснулі.

— Цябе гэта хвалюе? — запытальна зірнула на Варгіна Русалка. — Лепш даслухай пра Жыжаля да канца і не вадзі вушамі. Дык я далей расказваю, ага-а? Як адскочыў Жыжаль ад ракі, як закрычаў ад болю ці ад гневу вялікага, што не змог ён з вады жабер-траву выцягнуць. І як бы там ні было, але з таго часу стаў Жыжаль жабер-травы баяцца. Вось табе і бог агню!



Русалка спынілася. Спыніўся і кашэчы кароль. Ён нязвыкла нервова памахваў хвастом і пільна ўзіраўся ў мясцовасць, дзе яны апынуліся. Яго зялёна-жоўтыя вочы паблісквалі ў цемры, як два зыркія ліхтарыкі.

— Ды ты мяне не слухаеш, Варгін! — прамовіла Русалка. — Захваляваўся, што яшчэ адна машына прасігналіла? Дык тут жа шаша недалёка. Мы ўжо амаль да яе выйшлі.

— Бачу, што выйшлі да шашы, — адазваўся кот, і ў яго голасе чулася вялікае хваляванне. — Але справа не ў ёй, не ў шашы. — Ён раптам падняўся на заднія лапы, памацаў пучочак жабер-травы на тасёмцы, ці на месцы, і паляпаў Русалку па руцэ: — Ну, ты таго... — нечакана папярхнуўся і закашляўся: — Ужо вяртайся назад. Дзякуй табе. Далей я сам! Я ўсё пазнаў. Вунь, — паказаў ён у цемру лапаю, — той узгорак, на якім і ляжыць Змеевы камень. Адным словам, бывай! — і ён так імкліва сігануў у высокі бытьнёг, што Русалка нават ціхенька войкнула.

— Вой, і не развітаўся як трэба Варгін! Усё ж доўгую дарогу разам прайшлі. Але хоць дзякуй сказаў!

Яна паглядзела ў цёмнае неба, дзе яшчэ ярка свяціліся зоркі, і павярнула назад. Заспяшалася. Ёй трэба было вярнуцца ў падводнае царства яшчэ зацемна.

## КОТ ВАРГІН — СЕКУНДАНТ, альбо ПРА ЦАР-ЗМЕЯ І ЛЯТУЧАГА ЦМОКА

Шмат гадоў ён бачыць усё адзін і той жа доўгі сон. Сніцца, як гаспадыня хаты ставіць на падлогу сподачак з малаком, да якога тут жа падбягае маленькае чорнае кацяня з вялікімі зялёна-жоўтымі вачамі. Кацяня хлебча малако. І ён таксама выпаўзае са свайго схованкі, хуценька слізгае па падлозе да сподачка.

— О-о, глядзіце, дзеткі, наш Цар-Змей з-пад печы выпаўз, — кажа гаспадар, і дзеці адрываюцца ад вячэры, пачынаюць перашэптвацца.

Гаспадыня падлівае малака ў сподачак і прамаўляе:

— Ды які ж гэта Цар-Змей, Сцяпане: звычайны вуж, а бач, прыбіўся да нас, дык няхай і жыве.

— Вядома, — адазваўся гаспадар. — Думаю, што мы гэтаму вужу дастаткам сваім абавязаны. Грошы ў нас пачалі весціся.

— А я дык залатую карону на яго галоўцы бачыла, — пахвалілася прыгажуня Ніначка, старэйшая з гаспадаровых дачок. — Значыцца, гэта сапраўды Цар-Змей! Ён на Косцікавым камені ўчора ў кароне ляжаў, а як толькі я падышла, адразу споўз. Калі Косцік расчыніў сваё акенца, я і забылася пра Цар-Змея.

— Дык ты ўжо збегала да маладзенькага краўца, аднесла тканіну? — запыталася маці.

— Учора аднесла. Косцік сказаў, што да Сёмухі пашые спадніцу.



Чорнае кацяня гучна зафуркацела і адбеглася ад сподачка. Цар-Змей таксама папоўз пад печ, аднак паспеў з замілаваннем зірнуць на Ніначку. З-за яе ён і прыжыўся ў гэтых гаспадароў, якія і падумаць не маглі, што гэты вуж, як назвала яго гаспадыня, і ёсць той самы Косцік-кравец. Ноччу ён — Цар-Змей, а днём, калі запаўзае ў вялікі камень, ператвараецца ў прыгожага маладзенькага хлопца.

Міналі дні, тыдні і месяцы. І вось аднойчы раніцай, калі Ніначка засталася ў хаце адна, у коміне пачуўся грукат і на прыпечак пасыпаліся дробныя каменьчыкі. Ніначка спалохалася, выбегла на двор, каб паглядзець, ці не абваліўся комін. А як вярнулася ў хату, пабачыла фарсістага маладога хлопца, які адразу пачаў знаёміцца з ёй ды захапляцца яе прыгажосцю.

Каб жа яна ведала, што ў гэты момант адбывалася ў сэрцы Цар-Змея! Яно перапаўнялася гневам, таму што Цар-Змей адразу пазнаў у прыхадні трохгаловага лятучага Цмока, які, як і ён сам, умеў ператварацца ў прыгажуна хлопца. У нейкі момант Ніначку ў сенцы гукнула маці. Тут Цар-Змей і выклікаў лятучага Цмока на паядынак. Лятучы Цмок пагадзіўся. І дамовіліся яны без адкладу сустрэцца на наступны ж дзень на невялікай прагаліне ў непраходным гушчары за вёскаю.

— Трэба думаць, абыдземся без секундантаў. Навошта нам лішнія вочы, — сказаў лятучы Цмок.

— Ну так, абыдземся, — пагадзіўся Цар-Змей.

Але тут адазвалася чорнае кацяня, якое дагэтуль ціхенька спала пад лаўкаю:

— Я хачу быць секундантам Цар-Змея, — прамовіла яно і так блiснула сваімі







зялёна-жоўтымі вачамі ў бок лятучага Цмока, што той адразу адвёў свой позірк. А Цар-Змею Цмок сказаў:

— Ты, калі хочаш, можаш узяць сваім секундантам гэтага здыхліка. Ну, а я ў секунданце для сябе не бачу патрэбы.

На тым і разышліся. А калі на наступны дзень на самым досвітку Цар-Змей выпаўз на лясную прагаліну, дзе павінен быў адбыцца паядынак, і пабачыў трохгаловага Цмока, яго гарачае сэрца забілася моцна-моцна. Кожная з трох галоў Цмока дыхала агнём, а агідны тоўсты хвост трушчыў дрэвы. І ўсё ж Цар-Змей уступіў у барацьбу, якая невядома чым магла скончыцца. У нейкі момант яму здалося, што апошнія сілы пакідаюць яго, але тут на ўскраі прагаліны ён заўважыў маленькае чорнае кацяня. Яно, падняўшы лапкі ўгору, качалася і ўсяляк выгіналася на пні, быццам гэтым сваім качаннем хацела прыцягнуць увагу лятучага Цмока. «Ну і секунданта ж я сабе ўзяў!» — ледзь не ўскрыкнуў Цар-Змей у вялікай роспачы. А кацянятка раптам усхапілася, поўсць на яго спіне ўздыбілася, а само яно, не маргаючы, утаропілася ў Цмока, быццам хацела яго працяць позіркам. І дзіва дзіўнае! Толькі Цар-Змей хацеў крыкнуць лятучаму Цмоку: «Я здаюся! Ты перамог!», як тут жа Цмокавы галовы пачалі з трэскам лопацца. З адной з іх выляталі хрушчы, з другой — матылі, з трэцяй — восы, якія роем закружыліся над прагалінай.

— Кацяня, ты дзе? Сцеражыся восаў! — закрычаў Цар-Змей і хутка-хутка папоўз да таго пня, на якім ён толькі што бачыў кацяня. Ды маленькага кацяняці ўжо не было на тым пні. Толькі вялізны чорны кот імкліва пранёсся міма Цар-Змея і ў адзін міг схаваўся ў гушчары. А што да маленькага кацяняці, дык як ні чакаў яго Цар-Змей, яно не вярнулася ў гаспадарову хату, дзе яны не адзін год жылі разам. Ды і сам Цар-Змей у хуткім часе пакінуў яе, таму што прыгажуня Ніначка ўзяла

шлюб з добрым вясковым хлопцам. Ён стаў жыць у сваім камені. А неўзабаве да яго прыйшоў той самы вялізны чорны кот, якога ён пабачыў на лясной прагаліне... І толькі тады Цар-Змей распазнаў у ім ката Варгіна. Як жа даўно, як даўно гэта ўсё было!

Цар-Змей уздыхнуў і расплюшчыў вочы. Ён прыслухаўся і насцярожыўся. Яму пачулася, што нехта ходзіць наўкол яго каменя: туды-сюды, туды-сюды... «І не чалавек жа гэта, — падумаў ён. — Наўрад ці хтосьці з людзей адважыўся б прыйсці да Змеева каменя ноччу. Ды і патрэбы ні ў кога такой няма! Я ўжо даўно не ператвараюся ў Косціка-краўца».

Ён зноў прыслухаўся і зараз ужо вельмі выразна пачуў, што нехта скрабецца ў акенца, якое амаль урасло ў зямлю. «Камусьці ж я спатрэбіўся», — падумаў Цар-Змей і падпоўз да акенца. Ён з цяжкасцю прыадчыніў яго і запытаўся сваім сіплым голасам:

— Хто тут ёсць? Адгукніся, калі з добрым намерам!

— Эх-эх-эх! — зараз жа пачуўся радасны голас. — А ты, аказваецца, кепска бачыш у цемры, Косцік-кравец! Хутчэй згадвай, каму ты калісьці жоўтыя штаны тут пашыў, га-а? А яшчэ і цёмна-зялёны фрак ды жоўтую шаўковую кашулю. А потым да ўсяго гэтага і ніштаватае кашнэ падарыў з чорнага аксаміту!

— Варгін! — усхвалявана выдыхнуў Цар-Змей і шырока, як толькі змог, расчыніў каменнае акенца: — Залазь. Праз маю каменную сцяну ты не пройдзеш. Я доўга чакаў цябе!

І калі кот Варгін залез у камень, Цар-Змей запытаўся:

— А чаго ж ты цяпер не ў жоўтых штанах, і не ў цёмна-зялёным фраку, ды не ў той шаўковай жоўтай кашулі, кашэчы кароль?

— А-ат, — махнуў Варгін лапаю. — Зрэдку, бывае, перад кім-небудзь з'яўляюся ў гэтым сваім уборы. Перад Дамавухаю з'яўляўся. Ну і маладзенькая Русалка







мяне бачыла ў ім, як давялося стаць Вялікім цырульнікам. Ты добра мне ўсё пашыў. Уражвае! Але цяпер не да ўбрання. — Ён паглядзеў у адзін бок, потым у другі і сказаў: — Тут у цябе дзесьці павінен быць лаз у падзямелле, дык мне пранікнуць туды трэба. Па-іншаму прайсці туды не магу. Прастора для мяне надта ж незнаёмая.

— Якое падзямелле, Варгін! Мы з табою яшчэ не прывіталіся як след! Не абняліся па-братэрску! Столькі ж не бачыліся, — і Цар-Змей тут жа абкруціўся вакол яго, моцна сціснуў кашэчага караля.

— Мя-я-яў, — выдыхнуў кот Варгін і лёгенька выслізнуў з абдымкаў Цар-Змея. Ён ужо прыкмеціў бляшаную засланку і здагадаўся, што ўваход у падзямелле, якое ён шукае, знаходзіцца за ёю.

Цар-Змей перахапіў Варгінаў позірк і сказаў:

— Ну так, лаз у падзямелле за засланкаю. Жыжаль у падзямеллі, здараецца, як усходзіцца, дык да мяне сюды столькі попелу набіваецца! Жах! Без засланкі нельга. А ты,

відаць, сабраўся вайну Жыжалю аб'явіць, га-а, Варгін? Жабер-траву з сабою прыхапіў. Я, як толькі абняў цябе, адразу і ўцяміў, што да чаго.

— Жабер-трава сапраўды супраць Жыжаля, — адказаў Варгін. — Але не з ім у падзямеллі я маю намер пазмагацца. Злосны Пацук зрабіў сваёю нявольніцай мышку Паднорку, дачку цара Паднора. Я хачу яе вызваліць. Мне патрапіць у Паднoравы ўладанні трэба, — і Варгін рашуча сваёю тоўстай лапаю адкінуў засланку.

— Старога Паднора даўно няма, — з сумам прамовіў Цар-Змей. — А з Пацуком асцярожным будзь. Пад Пацуковым аблічам каварны вядзьмак хаваецца. — Цар-Змей уздыхнуў. — Мы і не пагаманілі з табою, Варгін. Ты некалі абяцаў мне хутка вярнуцца. А праз колькі гадоў вярнуўся, скажы? — І Цар-Змей апусціў сваю галаву ў залатой кароне, быццам хаваў позірк, поўны роспачы. — Зараз зноў пакідаеш мяне, як калісьці. І ці вернешся? — ціха сказаў ён.

Кашэчы кароль, які наважыўся ўжо праціснуцца праз лаз у падзямелле, азірнуўся, пачухаў за вухам. У яго голасе пачулася лагоднасць, але, трэба сказаць, не было ўпэўненасці:

— Не крыўдуй, Цар-Змей. Ты ж ведаеш, не люблю я доўга затрымлівацца на адным месцы. Але цяпер у нас наперадзе шмат часу для гамонак будзе, павер мне. Ну ўсё, зараз я сапраўды вельмі спяшаюся, — і ён па-гаспадарску змахнуў сваім пушыстым хвастом попел, што сабраўся за засланкаю.

## ВАРГІН ВЫЗВАЛЯЕ МЫШКУ ПАДНОРКУ

Кашэчы кароль уяўляў падзямелле, у якое так спяшаўся патрапіць, зусім па-іншаму. Таму, калі ён



апынуўся ў доўгім чорным калідоры, дзе земляная падлога была ўслана попелам, а на сценах і на столі было шмат сажы, адчуў сябе нават трошкі расчараваным. «Хмм-м, і гэта ўладанне магутнага бога агню?! Сціпла. Надзвычай сціпла! — ледзь не са шкадаваннем адзначыў ён і на ўсялякі выпадак дакрануўся да жабер-травы, што матлялася на шыі, ці на месцы пучочак. — Ну, а дзе ж ён сам, бог агню? Чаму Жыжаль ніяк не праяўляе сябе? — думаў ён. — Хоць бы дзе бачыўся водбліск ад яго вогненнай кароны?! Мя-яў, адна цемра наўкол ды куродым лезе ў вочы. — Кот Варгін азірнуўся ў адзін бок, у другі. — Недзе ж тут знаходзяцца і ўладанні цара Паднора, дзе цяпер на троне сядзіць пачварны Пацук. І там тая залатая клетка, у якой пакутуе няшчасная мышка Паднорка. А дзе? Дзе тыя ўладанні? Гэта мне пакуль невядома. Таму застаецца адно: трэба бегчы наперад, а там штосьці праясніцца».

І ён пабег па гэтым цёмным, змрочным калідоры, разпораз абтрасаючы з вушэй сажу, якая асыпалася са столі. У нейкі момант адчуў, што попел пад яго лапамі робіцца ўсё больш і больш гарачым. Ужо цяжка было трываць. Але ён усё роўна імкліва бег. Раптам наперадзе пачуўся гучны голас, які загрымеў пад чорным скляпеннем, як раскацісты гром:

— Ну і колькі ж гэта яшчэ я адступаць буду, га-а? Скажы, што табе трэба, Варгін, і я дапамагу табе!



Кашэчы кароль атарапеў і спыніўся: «Жыжаль!» Ён нават адразу і не знайшоўся што адказаць богу агню, які зноў адазваўся да яго:

— Дык чаго ты маўчыш, Варгін? Будзеш доўга маўчаць, лапы ў попелу апячэш! Не проста ж так ты ў мае ўладанні прыйшоў, ды яшчэ і з жабер-травою?

Кот Варгін ужо саўладаў з хвіліннай разгубленасцю і высока падняў свой пушысты хвост, быццам падаў знак Жыжалю, маўляў, усё ў парадку, я зараз адкажу табе. І ён адказаў:

— Мне трэба ў Падноравы ўладанні. Я хачу мышку Паднорку вызваліць. Яна там у залатой клетцы сядзіць.

На гэты раз Жыжаль не адразу падаў голас. Кот Варгін, пераступаючы з лапы на лапу, нецярпліва чакаў, калі ж адгукнецца Жыжаль. І вось бог агню сказаў:

— Ведаеш, кашэчы кароль, ва ўладаннях цара Паднора ў мяне сусед надта неспакойны аб'явіўся. Нейкі Пацук! Кажуць, што гэта — злосны вядзьмак. Яго даўно ўтаймаваць трэба. Ну, а ўладанні тыя так сабе, дробязь! Адна тронная зала ды яшчэ некалькі пакойчыкаў, якія ты праскочыў. Табе трэба вярнуцца назад. Недалёка ад таго лазу, праз які ты пралез у падзямелле, паваротка ёсць. Там другі калідор, вузейшы. Па ім і пабяжыш. Увапрэшся ў дзверы і пройдзеш праз іх. Ты ж майстар праходзіць праз што заўгодна!

— Хм-м, вядома, прайду! — і ажно павесялеў кот Варгін. Ва ўсялякім выпадку бадзёра адказаў Жыжалю: — Ты мне добра ўсё патлумачыў, бог агню. Дзякуй табе і бывай!

Пасля гэтых сваіх слоў кашэчы кароль развярнуўся і штосілы панёсся назад па цёмным, змрочным калідоры. Але цяпер ён быў больш уважлівым і ўмомант заўважыў паваротку, дзе трэба было яму збочыць. Звярнуў на яе і паімчаў далей. Нарэшце, ён пабачыў наперадзе чорныя, абпаленыя дзверы, пра якія яму сказаў Жыжаль.



І, не збаўляючы хуткасці, Варгін хацеў было ўрэзацца ў іх, каб тут жа апынуцца за тымі дзвярыма. Ды толькі ж усё атрымалася не так, як яму хацелася.

Як толькі кашэчы кароль наблізіўся да дзвярэй, яны з ляскам расчыніліся. І такое яркае святло ўдарыла яму ў вочы, што ён міжволі заплюшчыў іх. А калі расплюшчыў, дык вельмі здзівіўся. Здзіўляцца было чаму! Ён стаяў у зале, дзе ўсе сцены былі завешаны прыгожымі дыванамі. На падлозе таксама ляжаў вельмі пушысты дыван з дзівосным узорам. Са столі звісала люстра, зробленая з тонкага зіхатлівага крышталю. На залатых падстаўках усцяж сцен грувасціліся шкляныя шары, запоўненыя блакітным газам. А пасярод той залы стаяў залаты трон, на якім сядзеў тоўсты стары Пацук з маленькімі чырвонымі вочкамі. Ён быў апрануты ў белы гарнітур, расшыты золатам. І на грудзях у яго зіхацеў вялікі дыямент, які вісеў на залатым ланцужку.

Пацук даў магчымасць кашэчаму каралю агледзецца, а потым адазваўся да яго з вельмі непрыемнай усмешкаю:

— Што, уражаны, кот Варгін?! Ты толькі наблізіўся да маіх дзвярэй, а я ўжо расчыніў іх перад табою! Хі-хі-хі-і, — заліўся ён дробненькім старэчым смехам. — Ты не чакаў?! А ў мяне ж тут паўсюль камеры знешняга назірання. Я адсочваў увесь твой шлях па гаджэту. Нават слугам загадаў, каб пачастунак для цябе падрыхтавалі. Ты што любіш, Варгін, сушы ці свежыя вустрыцы?

Кашэчы кароль з цікавасцю азіраў залу, дзе яшчэ было шмат самых розных каштоўных рэчаў, якія адразу не кінуліся яму ў вочы. «Шыкоўна! Неверагодна шыкоўна», — думаў ён і нарэшце запытаўся ў Пацука:

— Адкуль гэта ўсё ў цябе?

— Адсюль! — тыцнуў Пацук тонкаю лапкаю з гострымі кіпцюрамі ў зіхоткі дыямент, што вісеў на залатым ланцужку ў яго на грудзях, і дадаў, поўны пагарды



да Варгіна: — Усё выключна адсюль, акрамя аднаго, — і ён махнуў лапкаю ўбок, у дальні куток: — Ну? Што ты там бачыш, кот Варгін?

Кашэчы кароль паглядзеў, куды паказаў Пацук, і яго сэрца міжволі зайшлося жалем і спачуваннем. У дальнім кутку ён пабачыў невялічкі залаты столік. На ім стаяла маленькая залатая клетка, у якой і была мышка Паднорка ў сваім бліскучым убранні, якое бывае толькі ў прынцэс. Яна то ўсхвалявана бегала па клетцы, то хапалася за залатыя пруткі і ціха шаптала:

— Ты знайшоў мяне, кот Варгін! Ты не дачакаўся мяне ў гарадской кватэры, дзе мы пазнаёміліся, і з'явіўся сам! Ах, мой кашэчы кароль, ты прыйшоў, каб выратаваць мяне!

— Ну ўсё, Варгін! Дастаткова, — злосна прахрыпеў стары Пацук і загадаў з пачуццём незадаволенасці: — Хопіць зіркаць на мышку-прынцэсу! Ты не адказаў мне, што ты любіш: сушы ці свежыя вустрыцы? Зараз я пляснy ў лапы і слугі пададуць табе мой пачастунак, як для самага дарагога госця.

— Вялікі дзякуй, — адказаў кашэчы кароль. — Але я не ўжываю ні сушаў, ні свежых вустрыцаў. У мяне меню больш сціплае.

— Значыцца, грэбуеш? — спахмурнеў Пацук і бліснуў на Варгіна сваімі чырвонымі вочкамі.

— Што ты! Што ты! — тут жа ўскрыкнуў кот Варгін. — Я ацаніў тваю гасціннасць, — ён імкліва кінуўся да залатога трона. І зараз жа паваліўся на мяккі пушысты дыван, пачаў качацца перад самым тронам. І так ужо самазабыўна ён качаўся, так выгінаўся ва ўсе бакі, рабіў такія неверагодныя выкрутасы, што стары Пацук у нейкі момант нават запляскаў у свае кіпцюрастыя лапы і закрычаў:

— Брава! Брава, кот Варгін!

Тут якраз кашэчы кароль і падхапіўся з мяккага дывана. Ён, не міргаючы, утаропіўся ў тоўстага Пацука, і Пацукова галава пачала распухаць. Яна распухала, распухала і, нарэшце, лопнула з такім трэскам, што крыштальная люстра зазвінела пад столлю. А з Пацуковай галавы пачала вылятаць моль. І молі было так многа, што яна ўміг абляпіла ўсе дываны і стала роем кружыцца і над блакітнымі шарамі, і над крыштальнаю люстраю, і нават над старым Пацуком, які ўпаў з трона і тут жа знерухомеў на пушыстым дыване.

Кот Варгін зараз жа апынуўся каля Пацука. Ён сарваў з яго шыі залаты ланцужок, на якім вісеў дзівосна-бліскучы дыямент. А мышка-прынцэса, як толькі пабачыла, што ненавісны Пацук сканаў, радасна заскакала ў залатой клетцы і ўсё паўтарала і паўтарала:

— Ах, мой кароль! Ах, мой кароль! Ты перамог злоснага Пацука. Я захапляюся табою, кашэчы кароль!

Кот Варгін хутка кінуўся да клеткі, прасунуў праз залатыя пруткі дыямент на залатым ланцужку і сказаў Паднорцы:

— Гэты дыямент цяпер твой. Вешай ланцужок з дыяментам на шыю і загадвай жаданне, каб клетка расчынілася. Стары Пацук, напэўна, зачараваў яе. Яна на адмысловым замочку.

Паднорка гэтак і зрабіла, як сказаў кот Варгін. Загадала жадан-



не. І тут жа дзверцы залатой клеткі расхінуліся. Мышка-прынцэса выбегла з клеткі і запыталася:

— А ты куды зараз пойдзеш, кашэчы кароль? У тую кватэру, дзе мы пазнаёміліся?

Кот Варгін маўчаў, і мышка зноў пацікавілася:

— Дарэчы, ты пасябраваў з тымі дзецьмі, якія жывуць у той кватэры? Ты вернешся да іх, праўда?

— Навошта мне вяртацца ў тую кватэру, кхе-кхе? — Варгін закашляўся і адмахнуўся ад молі, якая закружылася ўжо і над імі. — Я адтуль збег, — прамовіў ён глуха. І яшчэ ён хацеў удакладніць, што збег, каб знайсці і вызваліць Паднорку, але сказаў зусім іншае: — Нам трэба хутчэй сыходзіць адсюль. Тут столькі ўжо молі, што мы хутка пачнем дыхаць пылам ад яе. Ды і Цар-Змей нас зачакаўся ў сваім Змеевым камені. Я абяцаў яму вярнуцца, — кот Варгін з замілаваннем зірнуў на Паднорку і заўсміхаўся: — Думаю, што Цар-Змей упершыню ў сваім доўгім жыцці пабачыць мышку-прынцэсу, ды яшчэ такую прыгожанькую!

Паднорка з недаўменнем зіркнула на кашэчага караля і адвяла вочы. Відаць, думала, што яму не спадабаецца тое, пра што яна яму зараз скажа. Але адважылася і сказала:

— Ах, навошта мне заставацца прынцэсай, калі ўжо няма майго бацькі, магутнага цара Паднора! — яна ўздыхнула, паглядзела на Варгіна і быццам папрасіла прабачэння: — Ведаеш, я хачу зноўку стаць звычайнаю шэраю мышкаю. — І пасля гэтых сваіх слоў яна хутка-хутка затараторыла, пэўна баялася, што кот Варгін яе перапыніць: — Я прадчувала, што ты сюды з’явішся! Я верыла, што ты мяне вызваліш, і ты мяне вызваліў! І нават вярнуў дыямент на залатым ланцужку. Дзякуй табе, кашэчы кароль! Але цяпер мне трэба спяшацца. Я засумавала па сваім лецішчы. Мне хочацца хутчэй вярнуцца ў сваю клець. Там так утульна! А гаспадар, калі прыязджае, заўжды пакідае мне на спадачку вельмі смачныя

кавалачкі сыру. Я вельмі люблю сыр. Ну дык я вяртаюся туды, кашэчы кароль? Так? — і ў знак прыязнасці, каб ён не крыўдаваў на яе, яна дакранулася сваёю маленькай лапкаю да яго вялікай тоўстае лапы. Потым куснула сябе за залаты кончык свайго хваста і ўмомант знікла, быццам растала ў паветры, дзе ўсё яшчэ з месца на месца пераляталі раі незлічонай молі.

— Мя-я-яў! — толькі і змог выціснуць з сябе кот Варгін. І яго зялёна-жоўтыя вочы пабляклі, страцілі свой ранейшы бляск. Але толькі на кароткае імгненне. Ён пацягнуўся, прагнуў сваю шырокую спіну, зрабіў некалькі павольных крокаў да дзвярэй. Яго вочы зноў загарэліся: — Мя-я-яў! — выдыхнуў кот Варгін на поўную сілу. — Ты чуеш мяне, Цар-Змей, адкідай засланку. Я хутка буду ў тваім камені!

І кашэчы кароль так імкліва пакінуў уладанне цара Паднора, што нават забыўся памацаць на сваіх грудзях пучочак жабер-травы, ці на месцы ён.

## ЭПІЛОГ

Прайшло некалькі тыдняў. Леанід Віктаравіч і Валянціна Пятроўна разам з дзецьмі цёплаю сонечнай раніцай ехалі на сваё лецішча.

— Яшчэ кіламетраў дваццаць і мы будзем на месцы, — сказаў Леанід Віктаравіч.

— Вой, Лёня, — усхвалявана ўскрыкнула Валянціна Пятроўна. — А я ж бутэрброды з сырам забылася ў халадзільніку. Далібог, не ўзяла іх! Што цяпер дзеці перакусяць, пакуль я нешта згатую на пліце?!

— Іх тата з халадзільніка забраў, — адазваўся з задняга сядзення Юрасік.

— Сын усё бачыць, — усміхнуўся Леанід Віктаравіч і сказаў жонцы: — Ты забылася ўзяць бутэрброды, дык я не забыўся. У мяне ж на лецішчы мышка знаёмая! Такая ўжо шустрая! Толькі прынясу ёй у клець спадачак







з сырам, як яна тут жа і выбягае з норкі. І, скажы ж ты, не баіцца мяне!

— Мамачка! Тата! Глядзіце, глядзіце! — раптам залямантавала малая Наташка, якая сядзела ззаду побач з Юрасікам, трымаючы ляльку Марысю ў руках. — Вунь наш Чарныш на вялізным камені!

— Сапраўды Чарныш! — крыкнуў Юрась, які тут жа паглядзеў у той бок, куды паказвала Наташка.

Леанід Віктаравіч тармазнуў, з’ехаў на абочыну і вылез з машыны. Зводдаль на адкрытым месцы ён пабачыў агромністы камень, на якім насамрэч сядзеў вялікі чорны кот.

— Ну, выліты Чарныш! — адазваўся ён да дзяцей, якія ўжо павыскаквалі за ім. — Што будзем рабіць? — паглядзеў ён на Юрася.

— Трэба забраць! — тут жа адгукнуўся хлопчык. — Не пакінем жа мы Чарныша ў гэтай бязлюднасці.

— Правільна сказаў, не пакінем! — Леанід Віктаравіч махнуў рукою: — Пайшлі дзеці!

І, калі яны ўжо трошкі адышліся ад машыны, ён засцярог іх:

— Вы тут у густой траве добра пад ногі глядзіце, каб на шкло якое не наступіць ці яшчэ на што. Вунь там жэрдка з дротам калючым ляжыць!

Наташка кінулася да жэрдкі і Леанід Віктаравіч спыніў яе:

— Куды ж ты, Наташка! Мы сюды прыйшлі не на жэрдку глядзець, а да каменя ідзем.





— Ага-а, да каменя, — разгублена прамовіў Юрась. — А Чарныша ўжо няма на ім.

Вялікага чорнага ката сапраўды не было на камені. І, як яго ні шукалі Леанід Віктаравіч з дзецьмі ў густой траве ды ў быльнягу, што рос наўкол каменя, знайсці так і не змаглі.

— Нас кот пабачыў і чамусьці спалохаўся, кудысьці зашыўся, — расчаравана сказаў Юрасік.

А Наташка захныкала:

— Мне шкада Чарныша. Навошта ён схаваўся ад нас?! Як ён тут будзе адзін!

— Мы, відаць, памыліліся, дзеці, — адазваўся Леанід Віктаравіч. — Пэўна, гэта быў не Чарныш. Вяртаемся назад.

І яны рушылі да машыны, дзе ўжо і Валянціна Пятроўна махала ім рукою, маўляў, хутчэй вяртайцеся.

А ў той жа самы час вялікі чорны кот, а гэта, зразумела, быў кашэчы кароль, ляжаў у камені. Ён некалькі гадзін правёў на свежым паветры і цяпер вырашыў адпачыць, тым больш што Цар-Змей даўно ўжо спаў у сваім цёмным куточку. Кот Варгін заплюшчыў вочы і вельмі хутка моцна заснуў. Ён толькі



аднойчы ўздрыгнуў, калі раптам у сне пабачыў мышку Паднорку. Яна бегала вакол каменя, на якім ён сядзеў, і ціха папісквала: «Не дагоніш, не дагоніш, не дагоніш!» А потым яму прыснілася не пані Эльжбета, як гэта было раней, а малая Наташка. Яна зазірнула пад пуфік, дзе ён ляжаў, і падражніла:

— Бе-бе-бе-е!

І заместа таго каб цыкнуць на яе, кот Варгін радасна сказаў:

— Прывітанне, малая! Ты не забылася пра ката Чарныша? Я, можа, яшчэ вярнуся да вас.



## ЗМЕСТ

З’яўленне ката Варгіна ..............................5

Ну і навошта нам кот! ..............................12

Пра клапатлівую Дамавуху
і шляхетнага Дамавіка ..............................22

Кот Варгін хоча сустрэцца з Дамавікам ..............................33

Варгін пачуў ад Дамавухі
пра дыямент на залатым ланцужку ..............................41

Фокус-мокус ад Варгіна ..............................49

Пра гарэзлівага Паветрыка
і саламяны капялюш ..............................60



Сустрэча з Русалкаю, альбо
кот Варгін — Вялікі цырульнік ....................73

Цікаўны Вадзянік распытвае рыбака
пра Кавалёў мост ....................81

Кот Варгін у падводным царстве ....................87

Русалка расказвае кату Варгіну
пра Ружовую фею і жабер-траву ....................98

Кот Варгін — секундант, альбо
пра Цар-Змея і лятучага Цмока ....................107

Варгін вызваляе мышку Паднорку ....................113

Эпілог ....................121



Літаратурна-мастацкае выданне

**БАРАВІКОВА** Раіса Андрэеўна

**ПРА КАШЭЧАГА КАРАЛЯ ВАРГІНА
І МЫШКУ ПАДНОРКУ**

Казкі з міфалагічнага люстэрка

Рэдактар *В. С. Рацэвіч*
Мастацкі рэдактар *А. В. Жыткевіч*
Камп'ютарная вёрстка *Д. С. Камейша*
Стыльрэдактар *В. С. Рацэвіч*

Падпісана да друку 14.03.2017. Фармат 84×108 $^1/_{16}$.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 13,44. Ул.-выд. арк. 10,50.
Тыраж 1200 экз. Заказ 1174.

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова
«Выдавецкі дом «Звязда».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/8 ад 02.08.2013.
Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск,
Рэспубліка Беларусь.

Адкрытае акцыянернае таварыства
«Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 2/3 ад 04.10.2013.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск,
Рэспубліка Беларусь.


Дамавуха
Дамавік
Вадзянік
Русалка
Цар-Змей
Лазнік
Пацук
Жыжаль



ISBN 978-985-575-129-9

EAC

Раіса Баравікова

# ПРА КАШЭЧАГА КАРАЛЯ ВАРГІНА І МЫШКУ ПАДНОРКУ